Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навынарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Змена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапаргі васкля тэксту — р. 50 к.
За радок шапаргі наскрозь тэксту 1 р. — к.
За радок шапаргі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчыя на 50 проц. дарожей.
Знак тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 162 (2350) Нядзеля, 15-га ліпеня 1928 г.

Тыдзень абароны — агляд нашай абароназдольнасьці

У барацьбе за мір будзем узмацняць абарону сацыялістычнай краіны.

Будзем на варце!

„Кожны рабочы, кожны селянін, кожны сумленны грамадзянін Савецкага Саюзу павінен заўсёды памятаць, што наш вораг ня дрэмле. Ня гледзячы на ўсе нашы імкненьні захаваць добрапрыяцельскія адносіны з буржуазнымі дзяржавамі, ня гледзячы на цьвёрды курс палітыкі міру СССР, мы штораз усё больш і больш назіраем непажаданыя выбрыкі з боку капіталістычных краін. Усе гэтыя выбрыкі носяць характар ваўнічага настрою нашых ворагаў, характар іх агресыўнай палітыкі. Вось гэта і сыгналізуе працоўным Савецкага Саюзу—быць на варце!

Быць на варце—гэта значыць быць заўсёды гатовым выступіць на абарону сваей сацыялістычнай бацькаўшчыны, на абарону заваёў Вялікага Кастрычніка і ўсіх тых дасягненьняў, якія мы маем на фронце нашай эканомікі і культуры.

Савецкая Беларусь, якая зьяўляецца аванпостам СССР, якая першай павінна будзе прыняць удар, накіраваны капіталістычнымі дзяржавамі на Савецкі Саюз, з напружнай сілай і энэргіяй мусіць узмацняць сваю абароназдольнасьць. Вайсковыя веды павінны быць усвоены самімі шырокімі працоўнымі масамі, аўладаць імі павінна усё насельніцтва, усе рабочыя і сяляне.

У «2-гі Тыдзень Абароны», які зараз праводзіцца па Беларусі, пытаньні ваенізацыі краіны павінны быць завостраны. Мы павінны, дэманструючы нашы дасягненьні, замацаваць гэтыя дасягненьні, а разам з тым, патрэбна выкарыстаць энэргію і ініцыятыву, а таксама сродкі сяброў Т-ва ТДА-Авіяхіму, каб палепшыць якасьць працы ТДА-Авіяхіму, каб шырока разгарнуць арганізацыйна-выхаваўчую працу т-ва.

Ня гледзячы на колькасны рост сяброў ТДА-Авіяхіму і на поўныя дасягненьні ў іх працы, шмат і вельмі шмат маецца недахопаў у гэтай працы, асабліва ў нізавых ячэйках. Сярод сяброў нізавых ячэек мала вялося практычнай працы, нізы ня былі ўцягнуты, ня былі зацікаўлены гэтай практычнай працай.

Гэтых недахопаў у працы ТДА-Авіяхіму мы ня выправім у «Тыдзень Абароны», іх трэба выпраўляць у штодзённай працы таварыства. Патрэбна, каб кожны сябра ТДА-Авіяхіму памятаваў, што мала быць толькі сябром т-ва і абмяжоўвацца сяброўскімі ўзносамі. Кожны сябар ТДА-Авіяхіму павінен умець уладаць вінтоўкай, карыстацца процівагазам, газавым убежышчам і г. д., і гэтыя свае веды павінен пашыраць сярод насельніцтва, прапагандуючы гэтым самым справу ваенізацыі, справу абароны Савецкага Саюзу.

У справу ваенізацыі, у справу падрыхтоўкі да абароны нашай краіны мала ўцягнута працоўнага насельніцтва, наша батрацтва, працоўныя жанчыны, наша савецкая грамадзкасьць,—іх патрэбна ўцягнуць у гэту справу, забясьпечыўшы як сьлед арганізацыйную і выхаваўчую працу. ТДА-Авіяхіму ў сваіх шэрагах патрэбна павесьці больш практычную працу, што бязумоўна выкліча большы інтарэс да сваіх абавязкаў кожнага сябра таварыства.

Мы вайны ня хочам, мы ваяваць ня зьбіраемся, але аб вайне мы павінны заўсёды памятаваць, да вайны мы павінны быць гатовы,—гэта лепшая забясьпека ад вайны, ад замераў ворага парушыць наша мірнае будаўніцтва. Калі кожны селянін і рабочы, кожны грамадзянін, кожны каму дорага наша сацыялістычнае будаўніцтва будзе ўмець уладаць вінтоўкай і ўсім тым, што патрэбна, каб у любы момант стаць у шэрагі Чырвонай арміі,—тады мы гарантаваны ад вайны, тады нам ніякія пагрозы вайною ня страшны. Пры агульнай увазе справе абароны нашай сацыялістычнай бацькаўшчыне, пры рэальнай дапамозе з боку ўсіх працоўных і ўсёй савецкай грамадзкасьці ТДА авіяхіму—гэта задача намі будзе выканана.

Прафсаюзы ў Тыдзень абароны

Падрыхтоўчая праца да «Тыдню абароны» па саюзах распачалася з 9 ліпня. Дні аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў фактычна зьявіліся днямі падрыхтоўкі да «Тыдню абароны». У гэты час па ўсіх прадпрыёмствах, клюбах, чырвоных куткох праводзіліся гутаркі на тэму аслабаненьня Беларусі ад белапалякоў, а таксама нападжваліся ўспаміны таварышоў, якія прымалі непасрэдны ўдзел у аслабаненьні.

У працягу „Тыдню абароны" прафсаюзныя арганізацыі правядуць гутаркі па ўсіх прадпрыёмствах і ўстановах на тэмы абароны СССР. Апрача таго, на агульных сходах сяброў саюзаў будуць заслуханы даклады аб працы сваіх ячэек ТДА-Авіяхіму. Гэтыя даклады папярэдня будуць абгаварвацца на пасяджэньнях фабзаўмясцкомаў.

Вышэйстаячыя прафсаюзныя арганізацыі правядуць праверку працы саюзных ячэек у справе аказаньня дапамогі вайсковым гурткам, ячэйкам ТДА-авіяхіму з тым, каб маючыяся недахопы ў працы апошніх ізжыць у далейшай працы.

КАМСАМОЛЬЦЫ ЯК КУЛЯМЁТУ.

Прафарганізацыі Менску наладзяць шэраг экскурсій у Музэй Рэвалюцыі, для азнаямленьня працоўных з тым тэрорам, які праводзілі белапалякі ў час акупацыі Беларусі.

Асаблівая ўвага будзе зьвернута прафарганізацыямі ня ўцягненьне ў ячэйкі ТДА-Авіяхіму дарослых рабочых.

Прэзыдыум ЦСПСБ даў дырэктывы, каб прафсаюзныя працаўнікі прынялі актыўны удзел у працы ТДА-Авіяхіму па ўзаемным азнаямленьні з працай ячэек апошняга.

Аўтадор і абарона краіны.

Мясцовыя арганізацыі Аўтадору прымуць самы актыўны ўдзел у правядзеньні кампаніі «Тыдзень абароны».

Адзін з асноўных лёзунгаў Аўтадору ў гэты тыдзень будзе—«даём аўтамабіль Чырвонай арміі». Гэты лёзунг ня будзе адарваным ад жыцьця:—усе ячэйкі Аўтадору ў «Тыдзень абароны» будуць праводзіць дабраахвотны збор сродкаў для варэньня фонду для набыцьця вайсковага аўтамабілю, які будзе з часам перададзены вайсковай часьці. Ёсьць надзея, што ў кожнай акрузе на сабраныя сродкі ўдасца набыць па адным аўтамабілі.

Вясковыя ячэйкі Аўтадору ставяць сабе задачу ў працягу бягучага сэзону дабіцца таго, каб сялянне таго ці іншага райёну, тэй ці іншай вёскі прынялі актыўны ўдзел у рамонце дарог і мастоў, бо добрая дарога і мост зьяўляюцца патрэбнымі селяніну ў яго штодзённым жыцьці.

Цікава адзначыць, што на тых шляхох, дзе зараз курсіруюць аўтабусы, сялянства пад уплывам вясковых ячэек Аўтадору ахвотна рамантуе дарогі выключна для таго, каб захаваць рух аўтабусаў.

У час кампаніі «Тыдню абароны» аўтабусы, якія езьдзяць па розных напрамках Меншчыны, будуць прыбраны лёзунгамі Аўтадору, маючымі сувязь з абаронай краіны.

Ва ўсіх ячэйках гораду і вёскі будуць у час «Тыдню абароны» праводзіцца агульныя сходы, на якіх будуць праводзіцца гутаркі на адпаведныя тыдню тэмы. Гарадзкія ячэйкі ў гэты тыдзень будуць выяжджаць у вёскі і праводзіць працу на ўцягваньню сялянства ў рамонт дарог і мастоў. Адным чынам ва ўсіх выездах гарадзкіх і ва ўсёй працы вясковых ячэек увесь час стаяла і будзе стаяць задача за падняцьце культуры нашых дарог.

Можна прывесьці шэраг прыкладаў, калі сялянства, пад уплывам мясцовых ячэек Аўтадору, праводзіла вялікую працу па рамонту дарог і мастоў.

Перад Аўтадорам зараз стаіць задача аб пашырэньні гэтых вельмі прыемных зьявішчаў—з адзінак трэба зрабіць масавую арганізацыю, у якой павінны прыняць актыўны ўдзел усё сялянства, бо добрых дарог вымагае ня толькі культурная рэвалюцыя, але і самаабарона Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Тыдзень абароны ўсіх працоўных

(Артыкул Намесьніка Старшыні Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету і Наркома Ваенных і Марскіх Спраў тав. КАМЕНЕВА).

Самым вялікім дасягненьнем да другога Тыдню абароны трэба прызнаць тое што сёньня да пытаньняў абароны маецца выключная зацікаўленасьць нашае савецкае грамадзкасьці і сапраўдная дапамога будаўніцтву на гэтым фронце. Само сабой разумеецца, што пры гэтых умовах фундамант абароны Саюзу становіцца выключна моцным і што самае галоўнае—гэты фундамант камень за каменем падводзіцца пад усе, так сказаць, бакі і напрамкі. Справа падрыхтоўкі да абароны пры гэтых умовах выходзіць з ведамасьцьвенных межаў і ўсё больш і мацней робіцца справай усіх працоўных нашага Саюзу.

Удзел працоўных Саюзу ў справе абароны ня можа ісьці ні ў якім параўнаньні з удзелам працоўных у гэтай справе заграніцаю. У часе вайны там, як і ў нас, працоўныя будуць у шэрагах арміі, але да падрыхтоўкі да абароны працоўных там не дапусьцяць. Не дапусьцяць таму, што гэта выкрывае тое, што пануючая класа дакладна хавае, а менавіта, што вайна і падрыхтоўка да яе для буржуазнае ніраўнічае клясы ёсьць прадпрыёмства, якое дае і аграмадны прыбытак і спосабы трымаць масы ў сваіх руках. А таму самы факт вайны, асабліва зараз, бязумоўна зьяўляецца момантам, абвастраючым клясавую барацьбу, а, значыцца, і адкрытая падрыхтоўка да вайны багата падобным абвастрэньнем.

Дык які-ж з буржуазных урадаў зараз згадзіўся-б дабраахвотна пайсьці на абвастрэньне клясавае барацьбы? Адгэтуль ясна, што ўцягваньне працоўных у штодзённую справу па абароне, ні падрыхтоўку да абароны для буржуазнага ўраду справа зусім не падыходзячая. Куды прасьцей для іх тайна падрыхтоўваць ваенную справу і супакойсаць працоўных «раззброеньнем», ды яшчэ пад кіраўніцтвам Лігі Нацый, што яны і робяць. Ня ўлічылі яны толькі аднаго, што абарона нашага Саюзу са справы нашых працоўных ўсё больш і больш выразна ператвараецца ў справу працоўных усяго сьвету і што калі сёньня працоўныя Саюзу будуць абарону сваёй краіны пры дапамозе і сымпатыях працоўных усяго сьвету, дык заўтра працоўныя ўсяго сьвету ня толькі будуць дапамагаць і прыхільна адносіцца, але сваімі рукамі возьмуцца за непасрэдную дапамогу нам у падрыхтоўцы абароны адзінае ў сьвеце рабоча-сялянскае дзяржавы.

Ці далёка гэта заўтра? Як далёка—ніхто ня скажа, але кожны прызнае, што кожны наш тыдзень абароны гэты тэрмін скарачае і тым набліжае заўтрашні дзень.

Сучасны тыдзень абароны ўжо больш будзе тыднем абароны ўсіх працоўных, чымся былі папярэдзіх тыдні абароны. Значыць, такім чынам, мы хутка дачакаемся сапраўднага тыдню абароны працоўных усяго сьвету.

Ал. Дудар.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ.

Ў лесе журавінамі
разьмятаўся жах:
пушчамі нізінамі
папаўзла мяжа.

Край перагароджаны
крэпкаю сьцяной.
Чорныя, варожыя
хмары над зямлёй.

Зналі мы й ня гэткія
катаржныя дні—
і зямля савецкая
і яе сыны.

Толькі мы ня гонімся
за дабром чужым:
хочам мы, каб кожны мог
працаваць і жыць.

Карамі, пагрозамі
нас не напужаць:
ўраз непераможная
ўстане наша рацъ.

Кулямёты бачылі,
з стрэльбай мы—радня:
сьцежкі ёю значылі
будучыны дням.

Гвалту ненавіснага
перарвецца ніць:
зноў каней у Вісьле мы
зможам напаіць.

Край свой абаронім мы
ад ліхой вайны.
Армія Чырвоная—
вольнасьці сыны.

Менская арганізацыя ТДА-Авіяхіму за 1½ гады існаваньня

ПА ШЛЯХУ ЎМАЦАВАНЬНЯ І РОСТУ.

Пачаўшы з падзеленых, неафорленых, ня маючых практычнае ўстаноўкі ў сваёй працы ячэек Авіяхіму і пасьля ТДА, якія налічвалі па акрузе ня больш 200 з колькасьцю членаў каля 12.000 чал., ТДА-Авіяхім за паўтара гады свайго існаваньня да 2-га Тыдню Абароны падыходзіць з вялізным балянсам 35.000 членаў ТДА-Авіяхіму, з якіх каля 10.000—30 проц. занята практычнай працай—удзельнічаюць у гурткох, зьяўляюцца членамі бюро, загадчыкамі цірaў, бібліятэкамі, ваеннымі куткамі.

725 ячэек—256 гурткоў—вось тое рэальнае дасягненьне, з якім ТДА-Авіяхім набліжаецца да другое гадавіны свайго існаваньня.

ВАЕНІЗАЦЫЯ ЗАМАЦОЎВАЕЦЦА.

Праслуханая 32-хгадзінная праграма, дзе побач з партыйцамі, ваенізавалася і беспартыйная маса даказала, што ваенізацыя зрабілася чымсь-та блізкім, неабходным, і што яе сабе ўявіў кожны сьвядомы грамадзянін СССР.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ СІЛ.

Прайшоўшы з вялікім посьпехам у лютым 1927 г. першы акруговы зьезд, дзе прысутнічала больш 400 делегатаў, дзе члены ТДА-Авіяхіму дэманстравалі свае посьпехі, праведзены ў суровым лютаўскія дні начны паход—дзе ўдзельнічала больш 400 членаў ТДА-Авіяхіму, даказвае, што арганізацыя жыве, мае глыбокія карэньні ў нізох.

Праведзеныя за год 4 стралковых выпярэдніцтвы, дзе ўдзельнічала 250 лепшых стралкоў ячэек, шматтысячныя дэманстрацыі—усё гэта даказвае, што стралковы спорт—адзін з асноўных элементаў ваенізацыі паступова укараняецца ў масу ТДА-Авіяхіму.

ЖАНЧЫНА-ПРАЦАЎНІЦА РОТЫ СУВЯЗІ І СТРАЛОК.

Ваенізацыя жанчын займае не апошняе месца. Арганізаваны і працуюць курсы сувязі 60 чал. Праведзена спэцыяльнае выпярэдніцтва жанчын на лепшага стралка—8-га сакавіка гэтага году.

Для дэмабілізаванага камскладу запасу арганізаваны курсы—скончыла—40 чал., якія зараз зьяўляюцца ўдзельнікамі сэкцый акрсавету.

НЕДАХОПЫ ВЫПРАВІМ.

Але апрача станоўчых бакоў нашае працы, мы тут таксама наглядаем і адмоўныя зьявішчы, напр., у працы па ўкараненьню хіміі яшчэ амаль нічога ня зроблена, атрады існуюць толькі на паперы. Не праведзена хімізацыя міліцыі і мадпэрсаналу. Не працуюць курсы начальнікаў хімкаманд.

Ёсьць недахопы і апаратнага характару. Няма дакладнае ўвязкі ў працы прэзыдыўму і сэкцый.

На ўсе гэтыя буйныя і дробныя недахопы неабходна зьвярнуць увагу ў гэты «Тыдзень Абароны» і іх выправіць.

З. Левін.

Жанчыны—удзельнікі ўсебеларускіх стралковых спаборніцтваў.

М. ЧАРОТ

ВАЙНА І БЕЛАРУСЬ.

Сягоньня сэрца мне ня ныв,
хоць захад шле вайны пагрозу...
Чакаю жудаснай вайны я,—
рыхтуй, краіна мая, сьлёзы!..

Рыхтуй ты сьлёзы, кроў, ахвяры,
гарматы, газы, кулямёты...
У віхры новага пажару
хай сьвет спазнае—хто ты!

Хто ты,
што зьдзек цярпела,
наволею жыла стагодзьдзі?!.
А сёньня ты гукаеш—годзе
дзікай вайны вярцець прапэлер!..

. . . . . .

Мы верым!
І быць так павінна!—
Надыходзіць час помсты, адплаты...
Беласток, Варшава і Вільня
ня зруйнуе мужыцкія хаты.

Ня страшна сіла нам
Лёндану і Бэрліну,
І Рыму і Нью-Ёрку..
Сьмела пройдзем сьмерці даліну,
даліну, кручы і ўзгоркі.

. . . . . .

Сягоньня сэрца мне ня ныв,
хоць захад шле вайны пагрозу...
Чакаю жудаснай вайны я,—
пральеш ты, Захад, свае сьлёзы!..

Пралье там сьлёзы ня мужык,
не пралетар—рабочы...
Заплача той—вайны хто хоча,
і ён з вайною разам зьніне.

Ты Беларусь—на рубяжы,
але ніколі не загінеш,—
ты не адна—усім скажы!
Масква чырвона, Украіна,
краіна вольных гор—Каўказ,
краіны Дальняга Усходу...
Калі вайна—то раз-па-раз
мы к'ном кліч свайму народу!
Народу, вольна што жыве
на Ўсходзе поўначы і поўдні...
І Захад хутка зружавее
у дзень вайны—дзень непагодзіны.

. . . . . .

За цябе, Беларусь, горда
пастаю на варце я мяны...
Утаймую шляхецкія орды,—
буду жыць—ці нямыцы!..

. . . . . .

Колькі загінула,
колькі забіта
тваіх, о краіна, дзяцей!..
А сёньня на полі,
што крывёю заліта,—
радасьць цьвіце!..

Буйным, залатым зернем
калосіцца шчасьце гаротных...
Ніколі, ніхто ня верне
няволю майму народу!

Няхай-жа і брат, што ў палоне
дзікай шляхецкай арды,
нашу радасьць адчуе сёньня,
гэтай песьняю дух свой уздыме

Ніхто, ніхто ня хоча вайны!..
Ну наму з нас ахвота паморці?!.
Але сэрца у кожнага ныв,
бо жыцьцё ўсё-ж пасвойму верціць...

А я? Я вайны не прарочу,
войнаў і так адбылося бяз ліку...
Але ты, Беларусь,
вайны хочаш—ня хочаш,—
а павінна быць Вольнай, Вялікай!

Ячэйка ТДА-Авіяхіму БДУ.

Арганізацыя налічвае 1400 сяброў (замест 400 у мінулым годзе) з актывам у 50 чалавек. Тут вам і 17 усялякіх гурткоў, якія яднаюць 400 чалавек.

Найбольш пасьпяховымі з іх аказаліся—хімічны, стралковы, планерны, радыё-тэлеграфны і інструктарскі. Хімгурток 3-га курсу пэдфаку выявіў сябе з лепшага боку: 100 проц. прысутнасьці і 100 проц. пасьпяховасьці.

Цір моцна зацікавіў студэнцкую масу і прапускаў штодзённа максымум стралкоў (40-50 чал.), хаця да рэчы сказаць цір быў кепска абсталяваны. Абяцаньне вам. рэктара т. Слоніма ў даным выпадку ня выканана. З за адсутнасьці цёплага пакою цір пачаў працаваць толькі вясною. Электрычнасьці ня было. Думаем, што ў будучым годзе цір прыме належны выгляд.

Плаверны гурток доўга заставаўся бяз прытулку. Праца разьвярнулася ва ўсю сваю шырыню і маленькі пакой не адпавядаў размаху працы. У будучым гэты пакой трэба заставіць для гуртка.

Беднасьць даводзіла да таго, што падчас ня было магчымасьці выкупіць прысланы з Масквы матар'ял. Акрсавет ТДА-Авіяхіму толькі потым, зауважыўшы, што гэты гурток толькі адзін на Беларусі, адпусьціў гуртку 100 руб.

Ня меншую цікавасьць выклікаў і радыё-тэлеграфны гурток. Хаця і не хапала літаратуры, ня было апаратаў, усё-ж зацікаўленасьць і акуратнасьць у працы была вялікая. У паколх агульнага памяшканьня самі гурткоўцы ў сябе пабудавалі «прыёмнічкі» і нават дзяўчатам у пакоі правялі «радыё-прыемнасьць».

Я ўжо не кажу аб інструктарскім гуртку, які выпусьціў кіраўнікоў для працы ў падшэфных ячэйках ТДА-Авіяхіму, аб лыжным, палітычным гурткох, у якіх, праўда, было мала лыж і ніводнай вінтоўкі, але заніміліся да канца году.

Жыва праходзілі вечары з дакладамі, лекцыямі і конкурсамі на лепшую разборку затвора, на хуткае адзіраньне процівагазу. Але адначасова былі і недахопы, асноўнае—скупасьць сродкаў. Праўленьне БДУ не плаціла тэхпрацаўніку па памяшканьню, у якім праходзілі заняткі, і ячэйка змушана была кожную нядзелю плаціць яму паўтара. руб. Патрэбныя апараты, інструманты ня куплялісь. Маючыяся куткі выключая пэдфак, былі бедны літаратурай. Бюро не працуе ва ўсім сваім складзе: з 12 чал. усяго заняты справай 4. Актыў слаба скарыстоўваецца. Рэвізійная камісія па працягу ўсяго году не пачала працаваць, ня гледзячы на просьбы самаго бюро праверыць сваю працу.

Ваенна-санітарныя гурткі прынялі пад сваё папячэньне Чырвоны Крыж. І што-ж?—Своечасова кіраўнікі ня прысылаліся. Урачы не адказвалі свайму назначэньню. Грубасьць, пяўмелы падыход, неакуратнасьць (ніколі не праверяныя Чырвоным Крыжам) разганялі гурткоўцаў.

— «Дайце мне чытаць лекцыі ў унівэрсытэце платна, тады вам буду працаваць»,—сказаў кіраўнік-урач Ваен. Аб. Бел. Школы.

Трэба адзначыць, што праца гурткоў была пагоджана з ваенным кіраўніком БДУ т. Пятровым—сябрам бюро ячэйкі, што дало магчымасьць практыцы зьліцца з тэорыяй ваенных ведаў.

Партыйныя і грамадзкія арганізацыі і праўленьне БДУ, Акрсавет ТДА-Авіяхіму і Чырвоны Крыж! Дапамажыце нашай ячэйцы выпрачыць усе вывіхі ў нашай працы.

З. Шмідт.

І дзяўчаты не адстаюць.

Рыхтуем асоавіяхімаўскі актыў для працы на вёсцы.

Як толькі праходзіць збор навабранцаў, дык мы ўцягваем у члены асоавіяхіму сотні чалавек і ўцягваем іх у работу. Але як толькі збор скончыўся і навабранцы разыходзяцца па вёсках, дык там яны ня толькі не вядуць ніякай работы, але нават і арганізацыйна не афармляюць ячэек. Гэта меда месца таму, што мы не падрыхтоўвалі з іх кадру работнікаў і, падругое, што райённыя арганізацыі слаба кіравалі гэтай работай. Выходзячы з гэтага, у гэтым годзе мы падрыхтоўваем актывістых па ўсіх галінах работы для ажыўленьня і кіраўніцтва работаю паміж зборамі. Кожная рота ўжо такіх актывістых вылучыла і пакуль што з імі толькі праводзіцца трыніроўка ў стрэльбе, бо яны будуць прыймаць удзел у спаборніцтвах у Тыдзень абароны, а пасьля Тыдню абароны з імі будуць праводзіцца заняткі ў пазашкольны час.

Вайскор.

Линейная калибровочная мишень LRT-RF4-V2

Гадавіна венскага паўстаньня.

(Ліст з Вены).

Год таму назад, 15-га ліпеня, сотні тысяч рабочых Вены, абураных апраўданьнем фашыстаў, здрадніцкі забіўшых некалькі рабочых у гарадку Шатэнбурзе, кінулі працу і выйшлі на вуліцу. Яны накіраваліся да парляманту, каб выказаць сваё абурэньне проці буржуазнае юстыцыі, пакінуўшай без пакараньня фашысцкіх забойцаў і тым самым падахвоціўшы іх да новых злачынстваў супроць рабочае клясы.

Калёны маніфэстантаў са ўсіх рабочых прадмесьцяў былі сустрэнуты ўзброенымі атрадамі паліцыі, якія загарадзілі ім дарогу. Гэта яўнае парушэньне законнага, прадугледжанага канстытуцыяй, права маніфэстацый і правакацыйныя паводзіны паліцэйскіх выклікалі ў масах абурэньне і моцны адпор, які абярнуўся ў стыхійнае паўстаньне.

У працягу некалькіх дзён на вуліцах Вены адбываліся бойкі між пралетарыямі і паліцэйскімі і ваеннымі сіламі аўстрыйскае „дэмакратычнае" рэспублікі. К 20-му ліпеня буржуазея сьвяткавала перамогу. Непакойная сталіца ачысьцілася ад барыкадаў, спыніліся пажарышчы, і 79 трупаў з целамі забітых рабочых былі зарыты на тых самых могілках, дзе пахаваны ахвяры рэвалюцыі 1848 году.

86 забітых і памёршых ад ран, каля 1000 параненых, дзесяткі ўдоў і сірот, 800 арыштаваных, з якіх многія пасьля былі засуджаны да зьняволеньня ў астрозе,—вось вынікі ліпнёўскай бойні.

Працоўныя ўсіх краін адказалі на агідную расправу з венскімі рабочымі ўсеагульным пратэстам і выяўленьнем братэрскае салідарнасьці. Усюды праводзіліся зборы ў карысьць сем'яў паўшых, у карысьць параненых і зьняволеных. Нямецкая „Чырвоная Дапамога" аказала прытулак сіротам ліпнёўскіх ахвяр, разьмеркавашы іх у сваіх дамох у Эльгэрэбурзе і Баркэндорфе. Рабочыя СССР далі магчымасьць адпачыць і аднавіць сваё здароўе ў Крыме групе параненых венскіх таварышоў, якія выпісаліся з больніцы.

Аўстрыйская буржуазея не абмежавалася забойствамі безабаронных рабочых. Венскі бургамістр, сацыял-дэмакрат Зэйц, забараніў зборы, арганізаваныя аўстрыйскім МОПР'ам у карысьць ахвяр ліпнёўскага паўстаньня, адначасова дазволіўшы зборы ў карысьць пацярпеўшых паліцыянтаў. Затым, каб зьнішчыць усе сьляды, урад Аўстрыі выпусьціў „Белую Кнігу", у якой ён спрабаваў апісаць падзеі 15-19 чэрвеня, як вымушаную самаабарону паліцыянтаў і ваенных сіл супроць напаўшага на іх натоўпу. У адказ на гэта аўстрыйскі МОПР выпусьціў і распаўсюдзіў у вялікай колькасьці экзэмпляраў „Чырвоную Кнігу", дзе прыводзіліся пэўныя даныя аб першай прычыне падзей, аб супрацоўніцтве ўраду з фашысцкімі баявымі саюзамі, аб забойстве малых дзяцей і падлеткаў.

З таго часу мінуў год. Далейшая чынпасьць кіраўнікоў Аўстрыі толькі пацьвердзіла ўзяты імі фашысцкі курс. Не забараняючы чорнасоценных саюзаў „Гаконкрэйцэраў", простая мэта якіх—прыдушэньне рабочага руху, яны забаранілі арганізаваны ў студзені гэтага году Саюз Чырвоных Франтавікоў, які па ўзору нямецкага Саюзу Чырвоных Франтавікоў меў сваёй непасрэдная задачай абарону рабочых сходаў і арганізацый ад нападу фашыстаў.

Выдача дзесяці югаслаўскіх рэвалюцыянэраў тэрарыстычнаму ўраду караля Аляксандра Карагеоргіевіча і ўзмацняемыя в кождым днём ганеньні на палітэмігрантаў сьведчаць аб тым, што Аўстрыя імкнецца ліквідаваць права прытулку для пралетарскіх эмігрантаў. Гэты намер пацьвердзіўся нядаўна ў справе Бэла Куна, які ня быў выдадзен вэнгерскім белабандытам толькі дзякуючы магутнай міжнароднай кампаніі пратэсту, арганізаванай МОПР'ам.

Апошнія тэлеграммы з Вены кажуць аб тым, што фашысцкія саюзы сьпешна рыхтуюцца да 15-га ліпеня. Яны арганізуюць у гэты дзень свае парады і працэсіі, каб прадэманстраваць сваю гатоўнасьць да новых забойстваў і зрываць жалобныя выступленьні пралетарыяту.

Рабочая кляса Аўстрыі і працоўныя ўсяго сьвету схіляюць у гадавіну ліпнёўскай бойні свае сьцягі перад памяцьцю яе ахвяр. На новы выклік аўстра-фашысцкае рэакцыі яны адкажуць магутнай дэманстрацыяй клясавае салідарнасьці і няўхільнае волі да зруйнаваньня панаваньня буржуазеі.

Л. Вольлер.

Вена, 6-га ліпеня 28 г.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Бурлівая забастоўка ў Лодзі.

ВАРШАВА, 13-7. На тэкстыльнай фабрыцы Пазнанскага ў Лодзі выдухнула забастоўка ў зьвязку са спробаю адміністрацыі зьнізіць заработак. Учора рабочыя, даведаўшыся пра пастанову адміністрацыі зьнізіць заработак, разграмілі канцэлярыю фабрыкі і зьбілі дырэктара. Дырэкцыя выклікала паліцыю. Здарылася стычка. Паранена некалькі рабочых і паліцэйскіх.

Пляны Пілсудзкага.

БЭРЛІН, 13-VII. Баўгарскі карэспандэнт «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг» паведамляе чуткі, якія ходзяць у Варшаве, што 12 ці 13 жніўня Пілсудзкі выступіць на гадавым сходзе саюзу легіянэраў у Вільні з сэнсацыйнаю палітычнаю прамоваю, у якой выкажа свае пляны наконт «новай установкі польскага дзяржаўнага арганізму». Думаюць, што зараз-жа пасьля выступленьня Пілсудзкі накіруецца ў Варшаву для выканаьня нейкага буйнага пляну. Асабліва цікавым лічаць, што ў дзень выступленьня Пілсудзкага з яго прамоваю ў Вільні будзе знаходзіцца таксама і польскі прэзыдэнт. Апроч таго, у гэты-ж самы час у Віленскім ваяводзтве маюць адбыцца манэўры 4-х дывізій. Нарэшце падкрэсьліваецца таксама, што да гэтага часу ўраджай будзе амаль што ўвесь сабраны.

НАПЯРЭДАДНІ ДЫКТАТУРЫ ПОЛЬШЧЫ.

БЭРЛІН, 11-7. У апошнія дні польскі ўрад ужыў рад захадаў, якія апазіцыйн характарызуюцца, як „дыктатарскія". Так, напрыклад, забаронены шмат сходаў.

Адносіны між урадавымі і апазіцыйнымі партыямі вельмі напружаныя.

Польска-нямецкія дачыненьні.

ВАРШАВА, 13-7. Друк са здаволеньнем абмяркоўвае прамову Гіндэнбурга, выказаную ў часе перадачы вярыцельных грамат новым польскім пасланьнікам у Бэрліне Кіоле. Газэты выказваюць надзею, што хутка будзе ўтворам польска-нямецкі гандлёвы ўгавор.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ З ЛУКІШАК.

На гэтых днях звольнілі з Лукішак Смакілу, 100 проц. інваліда, які ў працэсе «Грамады» абвінавачваўся ў арганізацыі „боюзак". Смакіла моцна падупаў на здароўі і ляжыць цяпер хворы.

Таксама ня так даўно звольнены з турмы гр. Родзька з Дзісьненшчыны, кандыдат сьпіску, „Белар. Сял.-Раб. Аб'яднаньня" па Сьвянцянскай Акрузе.

РЭХА ГРАМАДЫ.

Надоечы адбыўся Апэляцыйны суд грам. Зьмітрука Аўласа з в. Ліпнікаў, Постаўскага пав. Як падае «Слово», гр. Аўлас быў у сваім часе засуджаны на 10 месяцаў вастрогу за тое, што ў часе паседжаньня гуртка Грамады ў яго хаце, быццам гаварылася „панскаму воку"—паліцыянту:, мы тут самі ўлада" і «ўсунуў» яго пры ўдзеле гаспадара з хаты.

Апэляцыйны суд гэты прысуд зацьвердзіў.

ТАЯМНІЧАЯ БАНДА Ў ВІЛЬНІ.

Віленская прэса падае, што апошнімі днямі цэлы рад віленскіх купцоў і прамыслоўцаў атрымаў пісьма ад нейкай таемнай банды (быццам амэрыканскай «чорнай рукі»).У гэтых пісьмах банда дамагаецца акрэсьленых і «грубных» грошаў, пагражаючы ў разе адмовы сьмерцяй. Банда не называе людзей, якім маюць быць даручаны грошы, а толькі ўказваюць месца, дзе яны маюць быць паложаны.

ПРОЦІ ПАДБАЎКІ РАБОТНІКАМ.

Апошнімі днямі ваяводзтва адкінула пастанову Віленскай Гарадзкой Рады аб 35 проц. павялічэньні платы гарадзкім работнікам працуючым на каналізацыйных работах.

ПОСЬПЕХІ БЕЛАРУСКАЙ РАДЫКАЛЬНАЙ ПРЭСЫ.

Што беларуская радыкальная прэса мае выключнае перад другімі газэтамі пашырэньне хіба усім вядома. Але, аказваецца, што думкі, якія яна праводзіла ў Зах. Беларусі, нашлі шырокі водгук і за граніцамі Польшчы, там, дзе яшчэ знаходзіцца беларускі народ.

ЗАБАСТОЎКА ПЛЫТНІКАЎ.

На рапе Бугу забаставалі плытнікі, гонячыя дзерава ў Быдгошч. Бастуючыя жадаюць 50 прац. падвышкі.

У «ЖАРДЭЛІ».

29 чэрвеня ў Жардэлі выехала з Навагрудка надзвычайная камісія, дзеля «zbadania» прычын, з якіх у лесапілцы стала выбухаюць забастоўкі. Можа гэтая камісія выкрые яшчэ якую новую «Амэрыку» работніцкай нэйды, апрача немагчымага вызыску іх капіталістамі?

ДРАЎНЯНЫМ КУПЦОМ «ХОЧАЦЦА».

Віленскія драўняныя купцы зьвярнуліся да міністэрства Промыслу і Гандлю з просьбай зьнижкі процантаў. У абшырным сваім мэморыяле яны наракаюць, што, дзякуючы ўзросту вывазу радавага дзерава на заграніччыя рынкі значна абнізіліся на яго цэны. А польскія купцы ня могуць збавіць сваіх цэнаў з прычыны «вялікіх падаткаў», дзякуючы чаму польскае дзерава, штораз, то менш купляецца на заграніччных рынках,—кажа гэты «мэморыял».

Зусім магчыма, што ўрад зьмілуецца над гэтымі „бедными" купцамі, бо-ж гэта «свае людзі».

СТАН ПАСЕВАЎ У ВІЛЕНШЧЫНЕ.

Статыстыка падае, што стан пасеваў у Віленшчыне прадстаўляецца агулам зусім блага.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

НЯМЕЦКА-ФРАНЦУСКІЯ ДАЧЫНЕНЬНІ.

ПАРЫЖ, 13-7. Пуанкарэ прыняў нямецкага пасла ў Францыі фон-Хеша і меў з ім доўгую гутарку. Газэты падкрэсьліваюць, што на будучым тыдні ў Парыж прыяжджае генэральны агент па рэпарацыях Гільбарт. Газэты зьвязваюць гэтыя два факты з праектам перагляду пляну Дауэса і з вырашэньнем пытаньня наконт датэрміновага вызваленьня Рэйнскай вобласьці.

„Нэйтральны ўрад".

ВЕНА, 13-7. Югаслаўскі кароль даручыў вайсковаму міністру генэралу Хаджычу сфармаваць так званы нэйтральны ўрад, у якім павінны ўдзельнічаць прадстаўнікі ўсіх абласьцей Юга-Славіі.

Немцы аб паводзінах Вальдэмараса.

БЭРЛІН, 11-VII. Некаторыя нямецкія газэты, абмяркоўваючы стан польска-літоўскіх дачыненьняў, крытыкуюць паводзіны Вальдэмараса, выказваючы сумненьне, ці адпавядае інтарэсам Літвы высоўваньне на першы плян Вальдэмарасам пытаньня наконт Вільні.

ПАДЗЯКА СССР ЗА ВЫРАТАВАНЬНЕ ГРУПЫ МАРЫЯНІ І ВІЛЬЕРЫ.

УВЕСЬ СЬВЕТ ЗЬДЗІЎЛЕН САМААХВЯРНАСЬЦЮ ЛЁТНІКА ЧУХНОЎСКАГА.

ІТАЛЬЯНСКІ ПАСОЛ ДЗЯКУЕ ЗА ВЫРАТАВАНЬНЕ.

МАСКВА, 13-VII. Старшыня камітэту дапамогі экіпажу «Італіі» Уншліхт прыняў у Рэвалюцыйным Вайсковым Савеце італьянскага пасла ў СССР Чэруты. Пасол выказаў ад імя італьянскага народу і ўраду глыбокую ўдзячнасьць за працу «Красіна», камітэту і савецкім вучоным, якія ўзялі ўдзел у справе дапамогі экспэдыцыі Нобіле. «Я спадзяюся,—сказаў пасол, што «Красін» з посьпехам выканае і другую сваю задачу—знойдзе Амундсэна і апошнюю групу экіпажу «Італіі». Я дзіўюся з Чухноўскага, які сваёй саамахвярнасьцю выказаў лепшыя якасьці лётніка і чалавека".

У адказе паслу Уншліхт заявіў, што камітэт ня лічыць магчымым скончыць на гэтым працу экспэдыцыі. Аднак, ня толькі камітэт і ТДА-Авіяхіму, але і ўся савецкая грамадзкасьць адчувае глыбокае задаволеньне, што мы здолелі дапамагчы дзелчом навукі, якія вывучаюць паўночнае канцавосьсе. „Задача экспэдыцыі «Красіна»,—зазначыў далей Уншліхт,—яшчэ ня выканана поўнасьцю. Трэцяя група экіпажу «Італіі» і Амундсэн з сваімі падарожнікамі зьяўляюцца нашаю далейшаю мэтаю ды і сам Чухноўскі яшчэ ня ў поўнай безапаснасьці. Аднак, пасьля таго, як «Красін» забярэ спатканую ім групу, як відаць, альпійскіх паляўнічых, ён накіруецца да Чухноўскага і яго 4-х падарожнікаў, каб забраць іх".

Уншліхт таксама зазначыў, што лётнік Чухноўскі сапраўды зрабіў вялічэзную дапамогу экспэдыцыі. Далей Уншліхт сказаў, што толькі дзякуючы энэргіі экіпажу «Красіна" і яго імкненьню абавязкова дапамагчы экіпажу «Італіі», экспэдыцыя здолела так удала пагодзіць працу самалёту і лёдаколу.

У адказ на гэта пасол заявіў: „Бясспрэчна, праца «Красіна» і яго экіпажу была надзвычайнаю працаю, выкананаю з вялікаю самаахвярнасьцю, якую прызнае ўвесь сьвет».

Чэруты паведаміў яшчэ аб атрыманьні тэлеграмы ў пасольстве, што «Чыта ды-Мілана» мае загад забясьпечыць дастаўку вугалю «Красіну» ў 2-х пунктах—у Кінэбэі і Адэнэбэі.

* * *

МАСКВА. Італьянскі пасол у СССР Чэруты наведаўся да намесьніка Народнага Камісара па Замежных Справах Карахана і выказаў ад імя італьянскага ўраду ўдзячнасьць за выратаваньне «Красіным» групы Мальграма і групы Вільеры.

* * *

МАСКВА, 13-7. Італьянскі пасол Чэруты прыняў супрацоўніка ТАСС, у гутарцы з якім заявіў: «Я выказваю ўдзячнасьць і вітаю савецкую грамадзкасьць з вялікім посьпехам савецкай экспэдыцыі выратаваньня. Ад імя італьянскага караля я выказваю шчырую падзяку савецкаму ўраду за надзвычайную працу лёдакола «Красін», савецкіх вучоных, каманднага складу і ўсяго экіпажу «Красіна». Нарэшце, пасол заявіў, што савецкая грамадзкасьць можа быць упэўнена, што імёны выратаўшых экіпаж «Італіі» назаўсёды застануцца ў памяці італьянскага народу.

ПАДЗЯКА АД ІТАЛЬЯНСКАГА ЎРАДУ.

РЫМ, 13-7. Да паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Італіі т. Курскага наведаўся таварыш міністра замежных спраў Грандзі, які ад імя ўраду выказаў глыбокую ўдзячнасьць за савецкую дапамогу, ахарактарызаваўшы яе, як „навукова-арганізаваную, не насьпех падрыхтаваную і надзвычайна шпарка выкананую».

Мусаліні дзякуе за выратаваньне „Італіі".

РЫМ, 12-VII. Агенцтва Стэфані паведамляе: «Сёньня раніцаю Мусаліні даручыў таварышу міністра замежных спраў Грандзі наведацца ў пасольства СССР і выказаць савецкаму ўраду праз яго пасла глыбокую ўдзячнасьць італьянскага ўраду і народу за выкананую экспэдыцыяй «Красіна» вялікадушную і адважную справу выратаваньня каманды «Італіі».

* * *

РЫМ, 13-VII. Агенцтва Стэфані паведамляе: «Прафэсару Самайловічу Мусаліні паслаў такую радыёграму: «Вы зрабілі справу, якая ўвойдзе ў гісторыю арктычных экспэдыцый і актаў шляхетнасьці і чалавечнасьці. Я выказваю ўдзячнасьць ад імя італьянцаў і прашу перадаць падзяку таксама ўсім вашым супрацоўнікам».

ПАДЗЯКА НАРВЭГІІ ЗА АДВАЖНУЮ ПРАЦУ.

ОСЛО, 13-VII. Нарвэскі прэм'ер Мовінкель у гутарцы з прадстаўніком афіцыйнага органу «Дагблят» зрабіў такую заяву: «З глыбокім аблягчэньнем і ўдзячнасьцю даведаліся мы пра ўдалыя вынікі выратаваўчай працы шведаў і асабліва расейцаў в іх лёдаколам «Красіным». Да нашай радасьці далучаецца сум з прычыны пагібелі Мальгрэма. Увесь сьвет чакае поўнай справаздачы аб той драме, якая разыгралася навакол «Італіі». Павінен прызнацца, што самая форма нявыразных паведамленьняў Нобіле здольна выклікаць недавер'е. Я спадзяюся, што нарвэсцы захаваюць спакой для аб'ект. ацэнкі катастрофы".

Нарвэскі друк спыняецца на нязвычайнай працы „Красіна" і яго кіраўнікоў, дзівячыся адважнасьці Чухноўскага.

Італьянскі пасланьнік у Нарвэгіі Эмон выказаў сёньня ўдзячнасьць паўнамоцнаму прадстаўніцтву СССР за працу пасланай экспэдыцыі дапамогі, прычым падкрэсьліў асаблівую самаахвярнасьць Чухноўскага.

Паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР паслала ў Стакгольм матцы Мальгрэма тэлеграму з выказам спачуваньня з прычыны сьмерці яе сына, а таксама выказала спачуваньне шведзкаму даверанаму ў справах.

Прызнаньне шведзкай прэсай выключнай адвагі нашай экспэдыцыі.

СТАКГОЛЬМ, 13-VII. Частка шведзкага друку пасьля варожых выпадаў проці савецкай экспэдыцыі, пры першых паведамленьнях аб посьпехах савецкай экспэдыцыі саромліва змоўкла. Сёньня «Стакгольмс Тыдніген» піша: Тое, што мы бачым, заслугоўвае зьдзіўленьня сваёю выключна чалавечаю мэтаю». «Сацыял-Дэмакратэн» з захапленьнем піша пра геройства Чухноўскага. Кансэрватыўная газэта «Аўтонблягет» піша: „Увесь сьвет павінен прызнаць выключную адвагу экспэдыцыі на „Красіне" і яго кіраўніка».

Вялікая радасьць у Італіі

з прычыны выратаваньня групы Мальгрэма і Вільеры.

РЫМ, 13-VII. Ранішнія газэты ў самых палкіх словах выказваюць удзячнасьць СССР за выратаваньне групы Марыяні і Вільеры. «Мэсанджэра» піша: „Мы адчуваем вялічэзную радасьць з прычыны цудоўнага выратаваньня экіпажу «Італіі» маракамі таго самага краю, які першы пачуў заклікі пацярпеўшых крушэньне. Усе італьянцы выказваюць удзячнасьць гэтаму краю». Газэта „Тэвэрэ" піша: «Наша пачуцьцё аб'яднае ў гэты час выратаваных і выратаўцаў—расейскіх лётнікаў і маракоў,—якія вырвалі з кіпцяў сьмерці гэтыя сьветачы жыцьця, згубленыя ў палярным лёдзе».

Як „Красін" выратаваў групу Вільеры.

МАСКВА. 13 ліпеня з лёдаколу «Красін» паведамляюць, што ўдзельнікі групы Вільеры адчуваюць сябе бадзёра; усе яны здаровы. Умовы, у якіх знаходзілася група, былі значна лепшыя за становішча падобнай групы Мальгрэма. Ад гандолы дырыжаблю засталіся толькі абломкі на адлегласьці поўкілёмэтра ад стаянкі групы Вільеры ў выглядзе алюміневых трубак, частак некалькіх прыладаў апаратаў і г. д. Група Вільеры мела па радыё вёсткі аб падыходзе «Красіна», аднак, ня ведала ніякай падрабязнасьці аб руху лёдаколу і была зьдзіўлена шпаркім прыходам «Красіна», тым больш, што ня бачыла палёту Чухноўскага. Група Вільеры заўважыла лёдакол на адлегласьці 13 кілёмэтраў, зараз-жа распачала страляць з рэвальвэраў, паліць ракеты, забраўшыся на самы верх самалёту Люндборга, даваць сыгналы сьцягамі, прымацаванымі лыжнымі кіямі і супакоілася толькі тады, як заўважыла, што „Красін" накіроўваецца непасрэдна да стаянкі групы. „Красін" узяў на борт усю маёмасьць групы. Зараз разьбіраецца пацярпеўшы аварыю самалёт Люндборга, які будзе таксама пагружан на лёдакол. Выратаваная група, знэрваваная паўтарамесячным побытам на лёдзе, адпачывае. „Красін" зьбіраецца на далейшыя адшуканьні, аднак, густы туман перашкаджае зараз-жа распачаць іх.

Ангельцы нічым не дапамаглі Нобіле.

ЛЁНДАН, 13-7. Дэпутат рабочай партыі Вэджвуд задаў у палаце вобшчын запытаньне, ці ня ганьбіць Англію тое, што ангельскі ўрад не дапамог ў арганізацыі адшуканьня і выратаваньня экіпажу «Італіі».

Міністр авіяцыі Хор адказаў, нібыта ангельскі ўрад паведаміў італьянскаму і нарвэскаму ўрадам аб сваёй гатоўнасьці пэслаць ангельскія самалёты на дапамогу экіпажу «Італіі". Аднак, гэта прапанова была адхілена з прычыны непрыстасаванасьці ангельскіх самалётаў да арктычных умоў.

АНГЕЛЬСКАЯ ПРЭСА АБ АПЭРАЦЫЯХ „КРАСІНА".

ЛЁНДАН, 13-УП. Ангельскі друк ізноў шырока агалашае паведамленьні ТАСС наконт выратаваўчай працы «Красіна». «Манчэстэр Гардыян» у перадавым артыкуле дае высокую ацэнку апэрацыям „Красіна".

„Красін" падабраў капітана Сора.

ОСЛО, 13-7. Нарвэскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе з Кінэбэю: «Водлуг атрыманых тут вестак, капітан Сора, які выехаў савнаю запражкаю на адшуканьне групы Марыяні, сёньня раніцою падышоў да лёдаколу «Красін» і ўзят ім на борт».

Пастанова пленуму ЦК УсеКП(б).

Тав. Кагановіч—сакратар ЦК УсеКП(б).

МАСКВА, 14-7. Пленум ЦК УсеКП(б) задаволіў просьбу т. Кагановіча Л. аб вызваленьні яго ад працы на Украіне і выбраў яго сакратаром ЦК УсеКП(б) і сябрам Аргбюро, вызваліўшы ад абавязкаў сакратара ЦК УсеКП(б) і сябра Аргбюро т. Касіёра С. з прычыны пераходу яго на працу на Украіну.

АБ ХЛЕБНЫХ СПРАВАХ.

(З перадавіцы «Правды»).

МАСКВА. «Правда» ў перадавіцы пад загалоўкам «Хлебазагатоўкі і скасаваньне надзвычайных захадаў» піша: «Вядома, што, пачынаючы прыблізна са студзеня, калі выявілася вялікая «дзірка» ў хлебадастаўцы, партыя прымушана была ўжыць у тэрміновым парадку некаторыя захады, у тым ліку і надзвычайныя, так званыя „экстра-ардынарныя». Зараз, у новых варунках, перад новай хлебазагатоўчай кампаніяй партыя гэтыя надзвычайныя захады рашуча скасоўвае. І робіць гэта па вельмі важкіх прычынах. Партыя ніколі ня лічыла і ня лічыць надзвычайныя захады нармальнымі для нашай палітыкі. У момант іх увядзеньня ЦК партыі катэгарычна падкрэсьліў іх часовы, сапраўды «экстра-ардынарны» характар. Рашучы наступ на капіталістычныя элемэнты будзе праводзіцца мэтадамі НЭП'у. Будучы для пэўнага пэрыяду неабходнымі «ўдарнымі» мерапрыёмствамі, якія зрушылі з мёртвага пункту хлебазагатоўкі,—надзвычайныя захады з некаторага часу становяцца абузаю, якая перашкаджае нармальнаму гаспадарчаму росту краю. Пры гаспадарчым эфэкце, які ўсё больш зьмяншаецца, прадоўжаньне надзвычайных захадаў нямінуча давала-б усё больш адмоўны палітычны вынік.

Тым больш, што, як вядома, настрой сярод бядняцка-сераднякіх гушчаў зьменьваўся за апошні час да горшага. Пачалі нарастаць элемэнты нездаволеньня адміністрацыйным свавольствам, якое мела месца ў практычным правядзеньні загатовак. Стварылася становішча, якое, цьвяроза ацэньваючы, можна назваць вядомаю пагрозаю ў сувязі пралетарыяту з галоўнымі масамі сялянства. У сучасных гаспадарчых варунках зусім зразумелымі, мэтазгоднымі і жыцьцёва-неабходнымі зьяўляюцца пастановы пленуму ЦК.

Адна частка пастаноў пленуму зьяўляецца адказам на перашкоды доўгага парадку; другая—адказам на бягучыя перашкоды кан'юнктурнага парадку. З пункту гледжаньня сучасных варункаў галоўнае зьвяно, за якое партыя павінна ўхапіцца і накіраваць сваю ўвагу, гэта—неадкладнае і рашучае скасаваньне надзвычайных захадаў, скасаваньне не на словах, а на справе, а таксама такое балянсаваньне народна-гаспадарчых элемэнтаў, якое выключала-б на будучы час неабходнасьць ужываць надзвычайныя захады».

„Малыгін" шукае Амундсэна.

ЛЁДАКОЛ «МАЛЫГІН», 14-УП. «Малыгін», карыстнючыся разьводзьдзямі, сёньня выходзіць на адшуканьне Амундсэна (на ўсходняе ўзьбярэжжа Шпіцбэргена).

ДЗЕ АМУНДСЭН?

МАСКВА, 13-7. Авіяцыйныя колы Масквы выказваюць зараз вялікую зацікаўленасьць лёсам Амундсэна. Супрацоўніку ТАСС выказалі два меркаваньні: згодна першага—Амундсэн, пры пералёце з Тромсэ на Шпіцбэрген міма выспы Мядзьвежай, пацярпеў аварыю ў адкрытым акіяне і сеў на ваду. У гэтым выпадку ён мог або загінуць, або быць занесеным на захад у напрамку да Грэнляндыі.

Згодна другога меркаваньня, больш праўдападобнага (яго падтрымлівае і Нансэн), Амундсэн накіраваўся непасрэдна да месца катастрофы групы Александры, і, такім чынам, можа знаходзіцца на лёдзе пры вымушанай пасадцы або ў райёне катастрофы Александры, або ў райёне на ўсход і паўночны ўсход ад выспы Карла і Вайча.

НЯМЕЦКАЯ ПРЭСА АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ „КРАСІНА" І ЧУХНОЎСКАГА.

БЭРЛІН, 13-7. Усе газэты зьмяшчаюць на першай паласе паведамленьне аб выратаваньні групы Вільеры «Красіным». Асабліва падкрэсьліваецца дзейнасьць лётніка Чухноўскага, самаахвярнасьць якога выявілася ў перададным ім радыё «не клапаціцеся аб нас, выратуйце спачатку іншых». «Форвэртс» піша: «Увесь культурны сьвет павінен быць удзячным экіпажу «Красіна» за адважную справу выратаваньня». У «Фосішэ Цэйтунг» зазначана: «За 2 дні «Красін» выратаваў 2 групы экспэдыцыі. Гэта было магчыма толькі ў выніку ідэальнага супрацоўніцтва самалёту, радыё і ледаколу».

Раскол сярод македонскіх аўтанамістаў.

ВЕНА, 13-VII. З Сафіі паведамляюць, што ў арганізацыі македонскіх аўтанамістаў здарыўся раскол. Прыхільнікі забітага Пратагерава склалі сваю ўласную арганізацыю пад кіраўніцтвам папа Хрыстова і агаласілі паведамленьне з абвінавачаньнем Міхайлава ў забойстве Пратагерава. У Сафіі ўчора справа дайшла да крывавай стычкі між абедзьвюма групамі македонскіх аўтанамістаў. У выніку стычкі шмат параненых; учынена шмат арыштаў. У гарадох Петрыч, Нэўракоп здарыліся такія-ж стычкі. Шмат забітых і параненых.

Посьпех камуністаў.

НЬЮ-ЁРК, 13-VII. У мэксыканскую палату дэпутатаў абрана 4 камуністы, у тым ліку вядомы лідэр чыгуначнікаў Лябордэ і лідэр нацыянальнай сялянскай лігі Гальван. Абодвы яны зьяўляюцца сябрамі ЦК мэксіканскай кампартыі.

Прысуд над польскім шпіёнам.

КІЕЎ, 13. Ваенны трыбунал №-скага корпусу засудзіў да расстрэлу актыўнага контр-рэвалюцыянэра і польскага шпіёна Івана Янкоўскага.

АБ СТАНОВІШЧЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ У МАЗЫРШЧЫНЕ.

(Уражаньні з падарожжа),

Калі глядзіш, які выгляд мае сельская гаспадарка Мазыршчыны, дык аказваецца, што ў гэтай галіне працы зроблена яшчэ зусім мала. Земляўпарадкаваньне дагэтуль разгортвалася слаба, процант земляўпарадкаванай плошчы амаль-што ніжэй, чымся ва ўсіх акругах БССР. Кажуць мазыране, што ня хочуць ехаць земляўпарадкавацелі за нізкую аплату пэнсіі. Але-ж гэта пытаньне часткова ўжо вырашана, бо ў бягучым гаспадарчым годзе Савнарком пастанавіў павялічыць пэнсію каморнікам на 20 проц. супроць існуючай у іншых акругах па гэй прычыне, што, бязумоўна, у Палесьсі, далёка ад культурнага цэнтру, мала ахвотнікаў спэцыялістых ехаць на працу. Але пасьля дабаўкі пэнсіі павінны акруговыя арганізацыі сабраць неабходныя сілы для падцягваньня тэмпу земляўпарадкаваньня, бо гэта праца ў сыстэме агульных мерапрыёмстваў па разьвіцьцю сельскай гаспадаркі зьяўляецца першачарговай працай, без якой марна думаць аб сур'ёзных мерапрыёмствах у сельска-гаспадарчым разьвіцьці. Нават ніводнай вёскі ня прышлося спаткаць, у якой было-б поўнасьцю праведзена земляўпарадкаваньне і каб пановаму вялася сельская гаспадарка. Затое можна спаткаць амаль што на кожным кроку знамянітую трохполку і нават пераложную сыстэму. Пытаю сялян: „Чаму гэта ў вас гуляе столькі зямлі, сена на ёй вы ня косіце, бо адзін бур'ян расьце і пахаць ня пашаце"? «Дык гэта, таварыш, мы сумысьля пакінулі яе, каб пагуляўшы пяць-шэсьць год яна больш радзіла; праз некалькі год пачнем яе пахаць, а ў другім месцы пакінем зноў для «адпачынку». Вядома, што гэта мэтад сярэднявяковы і ён застаўся мабыць толькі у Мазыршчыне; думаю, што ў іншых акругах гэтага ня знойдзеш. Дык ці можна пры такіх умовах гаварыць пра больш складаны севазварот, пра шматпольле?

Нават тыя вёскі яшчэ неземляўпарадкаваны, якія актыўна ад старога да малога прымалі ўдзел у партызанскім руху, напрыклад, Меляшковічы. Гэта вёска ўся далкам партызаніла, ваявала з акупантамі і многа за гэта пацярпела ад белапалякаў. Трэба яе абавязкова земляўпарадкаваць у першую чаргу.

Адначасна трэба сказаць некалькі слоў аб агрыкультурных мерапрыёмствах. У Мазыршчыне глеба зямлі, як характэрнае зьявішча, або пясчаная, або балоціста-прыпадлівая (глейкаватая) і ня больш як толькі напалову складаецца з супясаў, якія даюць добры ўраджай. Але ўся зямля, бязумоўна патрабуе ўгнаеньня. Вядома, угнаеньня ў сялян не хапае і таму самай найсур'ёзьнейшай праблемай там стаіць пытаньне аб ужываньні штучнага і зялёнага ўгнаеньня. Як жа гэта справа наладжана? Аказваецца, што штучнае і асабліва зялёнае ўгнаеньне там толькі ў праэкце, ды і мала хто клапоціцца аб гэтым. І гэта ёсьць самы вялікі мінус ва ўсёй працы як мясцовых зямельных устаноў, так і агранаміі, асабліва вучастковай агранаміі.

Найбольш актуальнай праблемай для Палесься наогул і ў прыватнасьці для Мазыршчыны зьяўляецца разьвіцьцё зялёнага ўгнаеньня. Пясчаная і прыпадлівая глеба—гэта ёсьць тая глеба, на якой можна і трэба ўжываць лубін, які дае вялічэзны эфэкт. Пры недахопе іншых відаў угнаеньня лубін можа і павінен адыграць самую сур'ёзьнейшую ролю ў сельскай гаспадарцы Мазыршчыны. Праблема лубіну для Мазыршчыны ёсьць праблема сур'ёзнага ўздыму сельскай гаспадаркі, самая сур'ёзная праблема павялічэньня ўраджайнасьці, тым больш, што там ён можа з пасьпяховасьцю ўжывацца, таму што клімат больш паўдзённы, чымся ў іншых акругах БССР, і што ён можа добра сьпець. Калі, скажам, у іншых акругах (Полацкая, Віцебская, Аршанская і інш.) лубін не заўсёды на пасеньне пасьпявае і то ў гэтых акругах ужо ўсё больш і больш пашыраецца сяўба лубіну, дык у Мазыршчыне і падаўна яму трэба быць. А як жа на самай справе там сеецца лубін? — Амаль-што ніяк. Па ўсіх вёсках, дзе прыходзілася бываць (а іх мы наведалі 15-20) і за грошы не пабачыш пасеянага лубіну. А што-ж вучастковая агранамія робіць? Калі запыталіся ў аднаго агранома, чаму-б не разгарнуць зялёнае ўгнаеньне, дык пачулі адказ такі: «сялянства, бачыце, яшчэ не зразумела карысьці ад гэтага» (!?). А калі ў сялян запыталіся: „Вось вы кажаце, што ў вас зямелька кепска родзіць, а чаму-ж вы ня сееце лубіну, які добра прыўецца на вашай глебе і значна павялічыць ураджай"? дык яны адказалі: «бедаеце, таварыш, мы спрабавалі (адзін гаспадар на ўсю вёску) пасеяць, ён якась-ці на ўдаўся, ну дык і ў іншых ахвоту адбіла, а паказаць ды парадзіць некаму, так мы і ня ведаем—ёсьць ад яго якая карысьць, ці няма». З гэтых прыкладаў відаць, што ў Мазыршчыне зусім мала працуюць над распаўсюджваньнем зялёнага ўгнаеньня.

Да слова, трэба закрануць вельмі характэрны момант, хоць гэта і не спадабаецца каму-калечы, нават і паскардзяцца іншыя. Ну што-ж, там, дзе ёсьць недахопы, там ня можна іх замазваць, хоць-бы гэта каму і не спадабалася. Заходзім у адным райённым цэнтры да вучастковага агранома і просім яго паказаць, як працуе агранамічны пункт і як арганізаваны аграгабінэт. І што-ж мы бачым у аграгабінэце? У адным пакоі 5-10 пучкоў рознай расьліны ды яшчэ... што-б вы думалі? калыска і грамафон, у другім пакоі тое-ж самае —такі-ж грамафон, толькі менш расьліны. Вось з гэтых рэчаў і складаецца аграгабінэт. Некатор

ЧАМУ ГОМЕЛЬ НЯ ХОЧА БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРУ?

Ці праўда гэта? Мы патрабуем тлумачэньня адпаведных гомельскіх установ па сутнасьці гэтага артыкулу.

На працягу апошніх 2-х год пасьля далучэньня Гомельшчыны да БССР у Гомелі ніводзін з беларускіх тэатраў сталай працы ня вёў, а паміж тым, тэатр, як фактар пашырэньня беларусізацыі, як сродак азнаямленьня шырокіх працаўных мас з беларускай культурай, для Гомелю надта і надта патрэбны. Здавалася-б, што Гомельскія арганізацыі ўжывуць усе захады, каб наступны 1928-29 год забясьпечыць Гомель працай аднаго з беларускіх тэатраў. Гэту патрэбу ў беларускім тэатры прызналі і шырокія партыйныя колы, ухваліўшы на канфэрэнцыі пастанову аб тым, каб у Гомелі працаваў беларускі тэатр.

Практычна-ж на справе выходзіць інакш.

У Гомелі, бачыце, справамі тэатральнай культуры ведае не інспэктура вараськветы, як гэта мае месца ва ўсіх гарадох БССР, а так званая «дирекция гомельских гостеатров» на чале з «дыректарам» тав. Маханура. Дык вось гэта «дырэкцыя» пачуўшы, што гомельскі тэатр мяркуецца врабіць падлеглым кіраўніцтву НКА і што гэта выклікала ў сваю чаргу сталую працу ў Гомелі аднаго з дзяржаўных тэатраў БССР, пачынае ад такой небясьпекі барыкадавацца. У сваёй дакладной запісцы на імя акруговых арганізацый «дырэктар» Маханура лічыць немэтазгодным кіраўніцтва тэо-справай непасрэдна НКАБ, бо гэта, бачыце, зьнімчыць уплыў на тэо-справу Гомельскага АВК. Выходзіць, што НКАБ на 11 годзе рэвалюцыі, пасьля праведзенай ім надта вялікай культурнай працы, працы па беларусізацыі культурных установ выклікаў недавер'е «директора гомельских театров" тав. Маханура. А наколькі такое недавер'е вынікла і наколькі паважаны «дырэктар» жадае пазбавіць Гомель ад беларускага тэатру і беларускай культуры, ён пачынае двейнічаць. Проста сказаць, што беларускі тэатр непатрэбны, ён ня хоча,—ён добра ведае, як партыец дырэктывы партыі, ён, бачыце, нават недае, «внес предложение о приезде в Гомель одного из белорусских театров» і нават пасылаў тэлеграму ў Наркамасьветы. Гэта па форме, а па сутнасьці: пасьля таго, як тэхнічны агляд НКА сцэны ў гомельскім тэатры прызнаў неабходным яе пашырэньне, што патрэбна для дзяржаўных тэатраў БССР, за кошт залі для відовішчаў, што, праўда, паменшыла-б залю на 100—120 месц, але затое дало-б магчымасьць на бліжэйшыя 2-3 гады працаваць тэатрам БССР і каштавала-б 10—15 тысяч руб. «Директор гостеатров» увынімае такі лямант аб немэтазгоднасьці такога рамонту і што ўжо калі рабіць рамонт дык на суму ня менш як 60 тысяч руб.

Сума вялікая, БССР бедная і выставіўшы гэткую суму „дырэктар" лічыць сябе забясьпечаным ад „посетителей". Аднак СНКБ лічыць важнай працу дзяржаўных тэатраў БССР у Гомелі і беларускіх--у прыватнасьці, а ў зьвязку з гэтым улічвае і неабходнасьць сталага рамонту і пастанаўляе дазволіць Гомельскаму АВК з крэдытаў наступнага году выдаць 50 тысяч руб., каб врабіць патрэбны рамонт. НКА на падставе гэтага накіроўвае ў Гомель БДТ 2, лічачы пытаньне з рамонтам скончаным. Але «дырэктар» незаспакойваецца і на пасяджэньні Гомельскага АВК падае праэкт рамонту ўжо больш чым на 100 тыс. руб. Не пазбавілі 60 тысяч ад беларускіх тэатраў, дык 100 пазбавяць. І роч вядомая, што гомельскія арганізацыі парапшылі рамонту не рабіць, а лепш пабудаваць новы тэатр, але тут ня прынялі пад увагу таго, што на новы тэатр патрэбна грошай тысяч 600—800 і што пабудова тэатру ў Гомелі ніякім плянам не прадугледжана. А калі-б нават і былі магчымасьці, дык пакуль гэты новы тэатр будзе пабудаваны, ніводзін з тэатраў БССР стала працаваць у Гомелі ня зможа.

„Мавр сделал свое дело"!

І ў гэты-жа час «дирекция гомельских гостеатров» пачынае розным чынам рабіць перашкоды. Пакуль ішлі гутаркі, пакуль людзі меркавалі дзе ўзяць на рамонт грошай, гомельская «Дырэкцыя» разам са смаленскім кіраўніцтвам тэатрамі робіць умову з расейскай драмай, аб мастацкіх якасьцях, якой мы гаварыць устрымоўваемся, і бярэ гэную драму на поўнае ўтрыманьне, выплачваючы асобным пэрсанажам гэтай драмы па 350 руб. у месяц.

Як бачыце, грошы знайшліся! Ня хоціць прыбыткаў ад драмы, дык АВК якую дзесятку тысяч, па прыкладу мінулых год, асыгнуе, бо, «бачыце, нельга застацца без расейскага тэатру». Яно, зразумела, можа яно і так, але ці нельга было-б абыйсьціся проста гастролямі «русской драмы»? Гэткім чынам мы можам НКАпавіншаваць з арганізацыяй у БССР ня ўжо аднаго дзяржаўнага тэатру «Гомельской русской драмы». «Дырэкцыя» ва ўмове з «русской драмой» вызначае тэрмін пачатку яе працы 15 студзеня 29 году, абавязаўшыся за непрадстаўленьне будынку тэатру ў гэты тэрмін няўстойкай каля 6 тысяч у месяц. Адгэтуль,—калі рамонт зацягнецца на які месяц, Белдзяржтэатру наогул некалі будзе працаваць, бо застанецца толькі 2 месяцы да прыезду «русской драмы», ды і няўстойкі ў 15-20 тысяч ніхто плаціць ня хоча.

Так „дирекция" гомельскіх гостеатров рыхтавалася да спатканьня БДТ-2.

Але БДТ-2 у Гомель прыехаў. Трэба, значыць, што-небудзь рабіць. Як кажуць: «гадка зьесьці, небясьпечна кінуць». Да гэтага пытаньня падыйшлі парознаму.

Адна адказная асоба акруговага маштабу рэкамэндавала бюро АК проста даць тэатру грошы на дарогу з Гомеля і... «вымятайцеся, браткі».

Другі адказны працаўнік знайшоў выхад у высылцы тэатру ў Рэчыцу, Добрушу, Хойнікі. Ды ці мала месца можна знайсьці ў Гомельшчыне, куды-б можна было загнаць Беларускі Дзяржаўны тэатр. Ня ўлічыў шаноўны таварыш толькі аднаго, што калі БДТ-2 ня можа па тэхнічных умовах працаваць на сучаснай гомельскай сцэне, дык у Рэчыцы і іншых месцох ён напэўна працаваць ня зможа.

Прапанавалі яшчэ перавесьці тэатр у адзін з клюбаў. Адным словам, „наблізіць да шырокіх працоўных мас".

Урэшце, гомельчане знайшлі выхад. Далі для тэатру будынак цырку. Цяпер у ім зьвярынец з заморскімі зьвярамі, як відаць і БДТ 2 для Гомелю зьяўляецца нечым накшталт заморскага зьвера. А пасутнасьці гэта значыць загадзя забясьпечыць беларускаму тэатру правал, бо ні гукавыя, ні тэхнічныя даныя цырку не дадуць магчымасьці нармальнай працы тэатру.

Гэты правал забясьпечаны нават і ў тым выпадку, калі на пристасаваньне будынку цырку будзе патрачана 15 тысяч руб. А наогул час праходзіць, рамонт ня робіцца, будаўнічы сэзон хутка скончыцца, тэатр патраціў сродкі на пераезд, а працаваць у Гомелі ня зможа.

Так спаткалі ў Гомелі беларускую культурную ўстанову. Пры такім спатканьні нельга спадзявацца на посьпех тэатру і ў часе яго працы. А таму можа адказны працаўнік акруговага маштабу і быў правы: „пакуль ня позна трэба выяжджаць", бо пакуль ідзе гэта цеганіна будаўнічы сэзон скончыцца і рамонту рабіць будзе нельга.

Менск, Магілеў, Ворша, Віцебск і іншыя гарады інакш сустракалі беларускія тэатры.

Украінскія пісьменьнікі, пагляджаўшы пастаноўкі БДТ 2, пісалі: «Харкаў і іншыя гарады Украіны з прыемнасьцю прынялі-б да сабе на гастролі БДТ 2»,а ў Гомелі, як бачыце, іншага месца чым цырк для БДТ 2 не знайшлося.

Што-ж. як кажуць, „сілай міл ня будзеш".

Шкода часу і сродкаў патрачаных на пераезд.

N N.

Ліпавы інжынэр і чырвоныя рэзалюцыі.

Мазыр. На апошнім пленуме гарсавету быў заслуханы даклад аб ходзе будаўнічых работ у горадзе.

„З будаўнічым сэзонам мы спазьніліся ўсяго толькі на 1 з пал.—2 месяцы, гаворыць дакладчык. А на справе спазьніліся на добрых 3 месяцы. Цэлую зіму складалі пляны і каштарысы, а калі прышлося будаваць, дык пляны не адпавядаюць патрэбам, ня ўлічаны фінансавыя магчымасьці. Аднаго інжынэра звольнілі, другі аказаўся (ліпавым) лжэінжынэрам. Калі яму далі вскіз на пабудову двухпавярховага дому, дык ён тры тыдні працаваў і ніяк ня мог скласьці яго. У яго выходзіла ўсё наадварот; напрыклад, калі трэба прайсьці ў кватэру, дык неабходна прайсьці праз уборную... і г. д.

Гарсавет, як прэзыдыум так і сэкцыі заслухоўвалі даклады, ухвалялі пастановы каля 40 пунктаў—і толькі. У будаўнічы плян гэтага году быў уключан пункт пабудовы з пустацелага камня двухпавярховага дому на 12 кватэр для рабочых. Пачалася загатоўка, гэтых плітак загатавалі каля 12.000 шт., заставалася загатаваць яшчэ 15.000 шт. аж тут успомнілі, што трэба паслаць на экспэртызу. Паслалі ў Кіеў, і там прызналі, што матар'ял, з якога выраблялся камень, не падходзіць і ён ня мог вытрымаць два паверхі. Добра, што загатавалі толькі яшчэ 12.000, якія пойдуць на другі паверх і ніжні будуць будаваць з цэглы, а цэглы не загатавалі і цяпер трэба ізноў клянчыць у камгаспадарцы. У сучасны момант маецца яшчэ цэлы шэраг затрымак з будаўнічым матар'ялам, няма жалеза, бляхі і г. д.

Аб рабочай амбуляторыі мы пісалі ў мінулым годзе, што ява скончана збольшага, і будзе скончана ў гэтым годзе, але што-ж мы бачым, ці скончаць яе ў гэтым годзе? Цяжка сказаць вось чаму—будынак драўляны стаяў цэлую зіму пад дахам з дасок. Цэлую зіму меркавалі як будаваць дах—ці жалезны звычайны, ці каменны плоскі, ды ніяк не маглі вырашыць. У сучасны момант ідзе падрыхтоўка да пабудовы каменнага даху, а ці вытрымае драўляны будынак? Праўда, акруговы інжынэр бярэ на сябе адказнасьць, але чым ён можа адказваць? Лясным матар'ялам таксама не запаслівіся, а цяпер прыходзіцца пераплачваць на 25 проц. да і матар'ял яшчэ сыры.

Адну заўвагу аб будаўніцтве амбуляторыі. Ёсьць чуткі, што водалячэбніцу мяркуюць пабудаваць на другім паверсе, а габінэты (некаторыя) на ніжнім, я сказаў-бы, што мэтазгодней пабудаваць водалячэбніцу на ніжнім паверсе, а габінэты—на верхнім, гэта будзе лепш для будынку.

Будуецца яшчэ 4-хкамплектная школа на фабрыцы «Красный Октябрь»; з матар'ялам там таксама ня зусім добра. Дзякуючы вытворчым нарадам рабочых удалося врабіць эканомію 35.000 шт. цэглы. У гэтым годзе мяркуецца пачаць пабудову гарадзкога тэатру, капітальна адрамантаваць 3 камунальныя дамы. Аб скарачэньні на 15 проц. таксама гаварыць ня прыходзіцца. Наогул, будаўнічы сэзон пачаўся з вялікім спазьненьнем, вінаватыя ў падрыве павінны быць пакараны.

Яўхім.

Лістаносцы нядбайна абслугоўваюць вёскі.

Барысаў. Лістаносец Шабыньскага пешага кальца Высоцкі замест абслугоўваньня насельніцтва некалькіх вёсак абслугоўвае толькі вёску Чарнявічы. Шэраг вёсак атрымліваюць лісты і газэты на некалькі тыдняў пазьней, пакуль з іншай вёскі хто ня прыдзе за газэтамі.

Сяляне прыходзяць у Н.-Барысаўскае аддзяленьне са скаргамі, апошняе ня прымае ніякіх мер да зьнішчэньня гэтых недахопаў.

Лістаносец вёскі Глівіна таксама не абслугоўвае сялян вёскі Гара. Сяляне бадай зусім не атрымліваюць газэт.

Усё гэта тлумачыцца тым, што лістаносцы абраны сябрамі сельсавету «начальствам», а пагэтаму яны нядбайна адносяцца да абслугоўваньня поштай прылічаных да іх вёсак.

На пленуме ЦКК КП(б)Б.

АБ ПРАЦЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК КП(б)Б.

З дакладу тав. Калініна

Значныя дасягненьні ў рацыяналізацыі апарату.—Трэба шырэй разгарнуць самакрытыку.—Яшчэ больш згуртаваць працоўных вакол сацыялістычнага будаўніцтва.

13 ліпеня а 6 гадзіне ўвечары адчыніўся чарговы пленум ЦКК КПБ(б)Б.

Першым пытаньнем заслухан даклад т. Калініна аб працы прэзыдыуму ЦКК.

Тав. Калінін у пачатку свайго дакладу зазначыў, што **асноўная ўстаноўка ў працы за апошні час выходзіла з рашэньняў і пастаноў XI зьезду КП(б)Б і XV зьезду ўсе-КП(б), галоўным чынам па лініі палепшаньня дзяржаўнага і гаспадарчага апарату, сталай праверкі,—як ідзе сацыялістычнае будаўніцтва, унутрыпартыйныя пытаньні, барацьба з бюракратызмам, і, урэшце, зьвернута асаблівая ўвага на ажыцьцяўленьне самакрытыкі. Вось асноўныя пытаньні, якімі займаўся ў апошні час прэзыдыум ЦКК КП(б)Б.**

Што зроблена па рацыяналізацыі апарату і яго набліжэньні да працоўных.

Мы маем значныя дасягненьні ў галіне рацыяналізацыі нашага савецкага апарату і яго набліжэньні да працоўных.

Той апарат, які рацыяналізован і пераведзен на функцыянальную сыстэму, мае значнае палепшаньне сваёй працы.

Некаторыя камісарыяты мала зварачваюць увагі гэтай справе. Праверка нізавога савецкага апарату (РВК, с.-с.) паказала, што ў ім таксама трэба врабіць палепшаньні.

Апрача гэтага, за апошні час РСІ праведзена абсьледаваньне, як ажыцьцяўляецца савецкая дэмакратыя. У гэтай галіне працы ня ўсё абстаіць добра: маем выпадкі, калі акрвыканкомы робяць кааптацыю новых членаў прэзыдыуму. Асабліва выпадкі кааптацыі назіраюцца ў райвыканкомах. У гарсаветах можна назіраць «начальніцкі» зажым і пагрозы, каб нічога не гаварылі пра начальства. Такіх фактаў ёсьць многа. У выніку ўсяго гэтага перад намі стаіць задача—**паглыбіць ажыцьцяўленьне савецкай дэмакратыі і палепшыць справаздачнасьць перад выбаршчыкамі.**

НК РСІ правёў вялікую працу па абсьледаваньні судовага апарату, дзе было выяўлена, што сыстэма судовага апарату ад НКЮ і да суда няправільна пабудавана. У сувязі з такой сыстэмай Вышэйшы суд ня меў магчымасьці арганізацыйна кіраваць судамі, а толькі сачыў за правільным рашэньнем судоў.

Ужо праведзена значная праца па разгрузцы судоў, шляхам арганізацыі таварыскіх судоў і судоў пры сельсаветах для разгляду дробных спраў.

Што датычыцца міліцыі, то абсьледаваньне выявіла зусім незначны процант рабочых, бягучасьць складу і ніякае матар'яльнае становішча. Да палепшаньня стану міліцыі з боку РСІ прыняты цэлы шэраг канкрэтных мерапрыёмстваў.

Недахопы ў гаспадарчым будаўніцтве.

Новыя фабрыкі і заводы амаль усе былі абсьледаваны РСІ.

Што-ж паказала абсьледаваньне? Паказала тое, што на кожным будаўніцтве ёсьць шмат буйных недахопаў. Напрыклад, на Добрускай ф-цы міліённае будаўніцтва вядзецца бязплянава. Апрача гэтага трапіцца шмат грошай на закупку заграніцай абсталяваньня, якое можна было набыць у СССР.

Другі прыклад — у Рэчыцы на запалкавай фабрыцы 8 раз складалі пляны і мелася 62 паломы ў часе будаўніцтва.

Апрача гэтага, заўважаны недахопы ў будаўніцтве і іншых прадпрыёмстваў (Бабруйскі камбінат, завод «Бальшавік» і інш.).

НК РСІ мае на ўвазе аб усіх недахопах у будаўніцтве выдаць спэцыяльную брашуру, каб даць магчымасьць кожнаму рабочаму добра пазнаёміцца з усімі гэтымі недахопамі.

На рацыяналізацыю ў прамысловасьці мала зварачваецца ўвагі. Некаторыя гаспадарнікі лічаць, што замест старага **катла** паставіў новы,—вось у гэтым і ўся іх рацыяналізацыя. Разам з рацыяналізацыяй прамысловасьці нам трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу на зьнішчэньне будаўнічнага індэксу, патаненьне сабекошту і на палепшаньне якасьці прадукцыі, уцягваючы ва ўсё будаўніцтва шырокія рабочыя масы.

Цяпер пару слоў аб с.-г. Тут таксама мы маем многа недахопаў: слабая аграпрапаганда і крэдытаваньне беднаты. Напрыклад, у Горках за сялянскія крэдыты будуюць хаты для служачых. Усе нашы мерапрыёмствы ў вёсцы ў першую чаргу павінны быць накіраваны для падняцьця бяднацкіх гаспадарак.

Праграма школьнага будаўніцтва ня выконваецца.

У гэтым годзе НК РСІ аддаваў куды больш увагі, чым летась, пытаньням культурнага будаўніцтва.

У гэтай галіне таксама маюцца недахопы.—Праграма школьнага будаўніцтва далкам ня выконваецца. Бязумоўна, што пры існуючых поглядах на будаўніцтва школ, праграма і далей ня будзе выконвацца. Ёсьць такія прыклады, калі замест школ будуюць электрастанцыі, ці што-небудзь іншае; замест таго, каб рамантаваць школы ў вёсцы, рамантуюць у горадзе.

Яшчэ горш абстаіць справа са зьнішчэньнем няпісьменнасьці. Кіравалі гэтай працай з дзесяці бакоў (НК Асьветы, прафсаюзы), а справа пастаўлена з рук вон.

Унутры вучэбных установ (я бяру сярэднія школы—тэхнікумы) маецца цэлы шэраг выпадкаў скрыўленьня клясавай лініі, нездаровых узаемаадносін і г. д. Хоць-бы, напрыклад, узяць музычны тэхнікум, там да рабочых вучняў адносіліся так: **рабочы грубы і ён толькі можа біць у бубен і трубіць у трубы.**

Як ажыцьцяўляецца лёзунг самакрытыкі.

Некаторыя працаўнікі нас запэўняюць у тым, што мы ўжо закрытыкаваліся. Бязумоўна, гэтыя погляды безпадстаўныя.

Я лічу, што самакрытыка ў нас яшчэ шырока не разгорнута, асабліва ў вёсцы. У нас яшчэ не ажыцьцяўляецца самакрытыкі сярод рабочых, таму што яны баяцца гаварыць. Таксама маецца няправільны погляд на высьвятленьне некаторых матар'яхаў у друку. Ёсьць выпадкі, калі парткамітэты ставяць пытаньне так, што перш, чым пісаць у газэту (пра партком, ці пра партыйца), трэба папярэдне ўзгадняць з ім (парткомам).

ЦКК—РСІ будзе весьці самую рашучую барацьбу і біць па руках усіх тых, хто перашкаджае разгортваньню самакрытыкі і хоча надзець намордник нашаму друку.

Ячэйкі і фабкомы яшчэ шчыльна не падыйшлі да канкрэтнага ажыцьцяўленьня лёзунгу самакрытыкі. (т Калінін падае цэлы шэраг прыкладаў аб самакрытыцы, асабліва па Віцебску і Полацку).

Разам з правядзеньнем самакрытыкі нам трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю мас, таму што пры арганізацыі мас РСІ будзе лепш спраўляцца са сваёй працай.

Апрача гэтага трэба будзе яшчэ больш высьвятляць у друку ўсё наша будаўніцтва і працу.

Хваробныя бакі ў партарганізацыі.

Адзін з хваробных бакоў—гэта рэлігійныя абрады. Гэты факт сьведчыць аб тым, што антырэлігійная праца слаба праводзіцца ня толькі ў масах, але і сярод партыйных мас (асабліва там, дзе культурны ўзровень партыйцаў нізкі).

Другая хвароба—п'янства, нават ёсьць шмат выпадкаў агіднага п'янства сярод партыйцаў. **Трэба ў некалькі раз узмацніць барацьбу з п'янствам у сэнсе яшчэ больш рашучых пакараньняў.**

Цяпер, што датычыцца адзінства ў партарганізацыі, то трэба адзначыць, што адкрытых апазіцыйных выступленьняў і груп няма. Цэлы шэраг т. т. адыйшлі ад апазіцыі, пераканаўшыся ў тым, што апазіцыя была ня права.

Нашы далейшыя задачы.

У аснову далейшых задач ЦКК павінна будзе палажыць наступнае: паглыбленьне самакрытыкі і рабочай дэмакратыі, барацьба з хворамі зьвязішчамі ў партарганізацыі, узмацненьне кантролю і праверкі дырэктыў і, урэшце,—увага арганізацыі мас, бо без арганізацыі мас КК на мясцох ня справяцца са сваімі задачамі.

Хроніка пленуму.

13 ліпеня на вячэрнім пасяджэньні і ўчора на ранішнім пасяджэньні адбываліся спрэчкі па дакладу т. Калініна.

Выступаўшыя ў спрэчках галоўным чынам спыняліся на наступных пытаньнях: безпляновасьць у будаўніцтве, слаба разгорнута самакрытыка, нават у некаторых партарганізацыях, асабліва ў вёсцы маецца значнае палепшаньне апарату: назіраецца шмат выпадкаў п'янства ў партарганізацыях. Делегаты гаварылі шмат і аб тым, што рабочыя і сяляне баяцца крытыкаваць сваё начальства.

Учора пасьля абмеркаваньня дакладу тав. Калініна, быў заслуханы даклад тав. Вінаградава аб вопыце прыцягненьня мас і чарговыя задачы КК РСІ ў зьвязку з лістом ЦКК УсеКП(б).

Сёньня будзе заслуханы даклад т. Эльвінда аб выніках праверкі 20 проц. зьнімаемых з дакладу

У Саведе Народных Камісараў БССР.

(Пасяджэньне 11 ліпеня г. г.).

На гэтым пасяджэньні пад старшынствам т. Галадзеда, М. М., былі разгледжаны разам з іншымі наступныя пытаньні.

АБ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ФОРМАХ МЯСЦОВАЙ ГАСПАДАРКІ.

Мясцовая гаспадарка, якая знаходзіцца ў веданьні акруговых і райённых выканаўчых камітэтаў і мясцовых саветаў, у гэты час зрабілася даволі значнай у сваім ахопе і характарызуецца паступовым узмацненьнем капітальных укладаньняў. Разьвіцьцё мясцовай прамысловасьці, утварэньне зусім новых камунальных прадпрыёмстваў, жылішчнае, школьнае і інш. будаўніцтва і паступовае ўзмацненьне бугаўніцтва шляхоў, ставяць перад выканаўчымі камітэтамі і мясцовымі саветамі новыя задачы ўмацніць рэгуляваньне і кіраваньне мясцовай гаспадаркі і ў зьвязку з гэтым больш дыфэрэнцыраваць яе паасобныя галіны для больш глыбокага вывучэньня і кіраваньня апошнімі. Разам з гэтым набывае асаблівае значэньне павялічэньне дэталізацыі функцыі выканаўчых камітэтаў і мясцовых саветаў з іх аддзеламі, а таксама ўзмацненьне тэхнічнага кіраваньня будаўніцтвам і падлік апошняга.

Дзеля гэтага СНК прызнаў мэтазгодным перагледзець да пачатку 1928-29 г. склад камунальных трэстаў і адмежаваць у іх камунальныя прадпрыёмствы і прамысловыя прадпрыёмствы, якія працуюць на рынак у тых выпадках, калі гэтае разьмежаваньне зьяўляецца рацыянальным. Павінен быць таксама перагледжаны склад існуючых камунальных трэстаў для перадачы райвыканкомам прадпрыёмстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі райёнаў і ўваходзяць у акруговыя камунальныя трэсты ня гледзячы на тое, што яны маюць чыста райённае значэньне і абслугоўваюць пэўныя насельныя пункты. Адначасна з пераглядам складу камунальных трэстаў СНК прызнаў патрэбным выключыць з трэстаў прадпрыёмствы, якія ня маюць вытворчага значэньня (гасьціницы, купальні, гарадзкі транспарт і інш.) і якія павінны быць у беспасрэдным кіраваньні гарадзкіх саветаў.

Гарадзкія прадпрыёмствы, якія цесна зьвязаны з гарадзкім дабрабытам і жылішчнай гаспадаркаю (каналізацыя, водаправод, электрычныя станцыі і інш.), павінны атрымаць асобнае арганізацыйна-гаспадарчае афармленьне і належнае плянава-тэхнічнае кіраваньне праз мясцовыя саветы і НКФ. Перагляд камунальных трэстаў ускладаецца на Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі. У зьвязку з значнымі лікам у складзе прамысловасьці райёнаў млыноў, НК Гандлю даручана разам з акрвыканкомамі вывучыць пытаньне аб магчымасьці ўтварэньня аб'яднаньня мукамольнай прамысловасьці. Падрыхтоўчай камісіі СНК даручана пераглядзець існуючае законадаўства БССР у адносінах кіраваньня і рэгуляваньня камунальнымі і прамысловымі прадпрыёмствамі як з боку мясцовых саветаў, так і з боку адпаведных наркаматаў. Разьмежаваньне паміж камунальнымі і прамысловымі прадпрыёмствамі мясцовай гаспадаркі павінна быць праведзена ў Менску, Віцебску, Гомелі і Бабруйску.

АБ ДЫРЭКТЫВАХ ПА СКЛАДАНЬНІ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ.

СНК пастанавіў пры складаньні мясцовых бюджэтаў на 1928-29 г. кіравацца ў асноўным наступным. Шэраг грунтоўных мерапрыёмстваў па гаспадарчым і культурным будаўніцтве, правядзеньне якіх у жыцьцё патрабуе ў наступным годзе значных сродкаў, прымушае зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўсебаковае павялічэньне даходнай часткі мясцовага бюджэту і ў першую чаргу непадатковых даходаў в тым, каб рост мясцовых бюджэтаў у сярэднім па БССР складаў ня менш 6,4 проц. З мэтаю разьвіцьця народнай гаспадаркі пры разьмеркаваньні сродкаў па паасобных галінах павінна быць зьвернута ўвага на неабходнасьць павялічэньня росту і ўдзельнае вагі выдаткаў на гаспадарча-вытворчыя патрэбы, а таксама і на культурна-сацыяльныя, зьвярнуўшы ўвагу на ажыцьцяўленьне плянаў усеагульнага навучаньня. Павінна быць зьвернута ўвага на неабходнасьць павялічэньня выдаткаў на капітальнае будаўніцтва, у паасобку будаўніцтва пачатковых школ і шляхоў павінна быць прадугледжана па бюджэту поўнасьцю ў адпаведнасьці з плянамі, а таксама павінны быць прадугледжаны сродкі на пабудову лекарскіх, ветэрынарных і агранамічных пунктаў. Пры складаньні бюджэтаў павінна быць узята пад увагу неабходнасьць асыгнаваньня сродкаў на ўпарадкаваньне мястэчак. Павінна быць зьвернута ўвага на ўзмацненьне правядзеньня мерапрыёмстваў, якія маюць сувязь з абслугоўваньнем культурных, бытавых і эканамічных патрэб працоўных жанчын, паводле пастановы ЦВК СССР за 26-Y—г. г.

Акрвыканкомам запрапанавана безадкладна распачаць падрыхтоўку будаўнічых плянаў з тым, каб тэхнічна будаўнічыя пляны былі зацьверджаны ў належным парадку не пазьней 1-га студзеня 1929 г. Акрвыканкомы пры складаньні бюджэтаў на 1928-29 г. павінны прыступіць да далейшага плянавага пашырэньня сельскіх бюджэтаў, а таксама ўзмацніць фінансавую базу існуючых сельскіх бюджэтаў праз перадачу ім даходных крыніц. Выходзячы з неабходнасьці стварыць спрыяючыя ўмовы для гаспадарчага і культурнага разьвіцьця г. Менску, як сталіцы БССР, а таксама бяручы пад увагу вялікае значэньне правадзімых у Менску буйных капітальных работ, СНК прызнаў патрэбным звольніць Менскую акругу на 1928-29 г. ад адлічэньняў в мясцовага бюджэту ў фонд рэгуляваньня. З мэтаю рэгуляваньня бюджэтаў па астатніх акругах, СНК вызначыў размеры адлічэньняў ад лясных даходаў у бюджэты гэтых акруг на 1928-29 г. Бюджэты кожнай акругі павінны быць складзены бездэфіцытна. НКФ разам з НК Сацыяльнага Забясьпечаньня даручана распрацаваць і падаць у СНК праэкт пастановы аб парадку забясьпечаньня састарэлых сялян.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Шляхавае будаўніцтва.

Ворша, 14-VII. Сёлета па акрузе пабудавана некалькі новых мастоў. Гэтак, у вёсцы Заложжа, Дрыбінскага райёну пабудован вялікі мост, каштоўнасьцю ў 6000 рублёў.

Ад Копысі да станцыі будуецца шаша даўжынёй—713 мэтраў, якая будзе каштаваць каля 9000 руб.

Будуюцца масты ў вёсках Выдрыса і Шыркевічы, а таксама ў м. Бюбр і ў в. Шырках, Багуш р., праз раку Бачалянку.

У Воршы працуе майстэрня па выпрацоўцы бэтонных кругоў.

Гэта майстэрня хутка перавядзецца ў Копысь, дзе ёсьць поўнае абсталяваньне.

Вучот закончан.

ТАЛОЧЫН, 14-7. У Талочынскім райёне закончыўся вучот аб'ектаў абкладаньня. Вучот прайшоў пры актыўным удзеле беднаты. Праводзіліся сходы беднаты, вылучаліся ад яе прадстаўнікі і г. д. У выніку ўсёй працы павялічылася пахаці на 55,48 дзес., пасеваў—55,45 дзес., сенажаці 17,34 дз., вульляў пчол на 14 калод, коняй на 25 шт., кароў—30, сьвіней—25 шт.

Авечак улічана толькі 140. Неземляробчых заробкаў павялічылася на 300 проц. альбо на 30000 руб.

Вучот ідзе слаба.

Бабруйск, 14-7. Прэзыдыум акрвыканкому, разглядаючы пытаньне аб правядзеньні вучоту аб'ектаў па сельска-гаспадарчаму падатку, прызнаў, што праца на мясцох па выяўленьню ўкрытых аб'ектаў праводзіцца слаба, праверачныя камісіі працуюць слаба, кепска праводзіцца праца па выяўленьню гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня падаткам. Прапанавана райвыканкомам узмацніць працу па правядзеньню вучоту.

Здача падатку да тэрміну.

Багушэўскае. Гр-н в. Замошша Стаселька Амяльян член Навасельскага с.-с., здаў 6 р. с.-г. падатку за першы тэрмін. Гр-н Стаселька выклікае іншых сяброў с.-с. па Багушэўскаму райёну ўнесьці да тэрміну с.-г. падатак, што будзе прыкладам для ўсіх сялян.

Сувязь з прыватнікам.

Бабруйск, 14-7. Органамі ДПУ і Камунгандлем у пякарні арцелі інвалідаў «Першае Мая» выяўлены сыстэматычны продаж булак прыватным гандлярам па падвышаных цэнах.

Справа накіравана пракурору для правядзеньня тэрміновага дасьледваньня. У хуткім часе вінаватыя стануць перад судом.

Ачыстка насеньня.

Бабруйск, 14-VII. За час веснавой насяўной кампаніі ў Бабруйшчыне працавала 103 пракатных пункты в розных сельска-гаспадарчымі машынамі. Агульны лік машын, якія меліся на гэтых пракатных пунктах дасягаў тысячы штук. У першую чаргу машынамі карысталася беднота і бясплатна. Значная частка гэтых пунктаў будзе працаваць і ў час асеньняй сяўбы.

Сельска-гаспадарчыя выстаўкі.

БАБРУЙСК, 14-7. У бягучым годзе на ўсіх райёнах акругі восеньню будуць праведзены сельска-гаспадарчыя выстаўкі.

Лепшым гаспадаром будуць выдавацца грашовыя прэміі і дыплёмы. Для большага абслугоўваньня сялянства выстаўкамі, па некаторых райёнах выстаўкі будуць арганізаваны ў 2-3 мясцох.

Каапэраваньне рабочых.

БАРЫСАЎ, 14-7. За апошні тры м-цы ўступіла ў каапэрацыю 907 новых пайшчыкаў. На першае сакавіка паявы капітал складаўся 52028 р. Сярэдні пай 9 руб. 37 к., а на 1 ліпеня—61840 руб., сярэдні пай—9 р. 57 к. Для ўступаючых ЦРК прадставіў ільготныя ўмовы.

Зараз лік пайшчыкаў дасягае 7000 чал.

30 новых калгасаў.

Ворша, *14-7. Сёлета па акрузе за лета мяркуецца арганізаваць 30 буйных калектыўных гаспадарак.*

Дзіцячая пляцоўка на Асінастрої.

Выдрыца, 14-7. Па ініцыятыве культкамісіі было ўзьнята пытаньне аб арганізацыі дзіячай пляцоўкі на Асінстрої. Па хадайніцтву культкамісіі адміністрацыя асигнавала на пабудову пляцоўкі 100 р. Апрача гэтага ўсе неабходныя прылады адміністрацыя дазволіла врабіць у майстэрні Асінстрою, як-та: сталы, лаўкі, шафы, клаўцы і інш. Зараз прыступлена да пабудовы памяшканьня для пляцоўкі, якое хутка будзе пабудавана. Апроч таго сход бацькоў ухваліў кожнаму ўнесьці на пляцоўку па 1 рублю.

„Выпускнік, цябе чакае вёска".

Чубатая наша доля, дрэнны наш лёс,—жаляцца выпускнікі Марына-Горскага садова-гароднага тэхнікуму.

Скончылі вучобу, атрымалі часовыя аб гэтым пасьведчаньні, рублёў па 10—13 грошай і... «кацісь, мой міленькі, за ветрам», а гэтак і прыходзіцца рабіць, проста за ветрам і паўзуць хто куды. Праўда, далі шэсьць практыканцкіх пасад на летні тэрмін, а астатнія васемнаццаць куды? (скончыла 24 чалав.)

Наркамасьветы кажа — я пасад не даю, зьвярніцеся ў НКЗ. НКЗ адказвае: пасады трэба шукаць прыватным чынам: врабіце запытаньні ў райёны і валяйце на пасаду, мы гэтай справай ня ведаем, пасьля новага бюджэтнага году, калі замацуюць наш бюджэт,—дык можа дадзім вам месц 10, але гэта ня пэўна. Акрамя таго ў НКЗ кажуць: з намі пытаньне аб адчыненьні садова-гароднага тэхнікуму не ўзгаднялася, і нам спэцаў па гэтай галіне амаль што цяпер непатрэбна.

Дык што рабіць? На вучот на біржу, ці што сунуцца? Большасьць выпускнікоў засталіся толькі з паперкамі аб скончэньні тэхнікуму, ды з галавой, а больш сродкаў ніякіх няма, за тры гады вучобы сувязь з домам супынілася, ды ад яе няма карысьці.

Гэткае становішча штогод назіраецца з выпускнікамі Марына - Горскага садова-гароднага тэхнікуму, у той час калі ў іншых тэхнікумах пасады назначаюцца зараз-жа пасьля выпуску.

Яшчэ незразумела, чаму прадстаўнікі ад вышэйшых кіруючых установ, на ўрачыстых пасяджэньнях, не шкадуючы, крычаць прыгожыя словы і громкія лёзунгі напрыклад: выпускнік, цябе чакае вёска, ці «выпускнік, ты правадыр культурнай рэвалюцыі ў вёсцы» у той час, калі нас ня пушчаюць у вёску, а мы запраўды жадаем стаць правадырамі культурнасьці

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

пра арэндную плату за зямельныя вучасткі, якія знаходзяцца пад ведамам прафесыянальных арганізацый і скарыстоўваюцца імі для мэт фізычнай культуры і культурна-асьветнай працы.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Ня брать з прафесыянальных арганізацый Беларусі арэндной платы за зямельныя вучасткі, якія знаходзяцца пад іх ведамам і скарыстоўваюцца імі беспасрэдна для мэт фізычнай культуры і культурна-асьветнай працы.

2. Гэта пастанова не пашыраецца на тыя зямельныя вучасткі, якія даюць даход ня зьвязаны беспасрэдна з карыстаньнем зямельных вучасткаў для мэт фізычнай культуры і культурна-асьветнай працы (фруктовыя сады і д. т. п.).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галодзед.**
Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **Угараў.**

25-га чэрвеня, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

об арендной плате за земельные участки, находящиеся в ведении профессиональных организаций и используемые ими для целей физической культуры и культурно-просветительной работы.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Не взимать с профессиональных организаций Белоруссии арендной платы за земельные участки, находящиеся в их ведении и используемые ими непосредственно для целей физической культуры и культурно-просветительной работы.

2. Настоящее постановление не распространяется на земельные участки, дающие доход не связанный непосредственно с использованием земельных участков для целей физической культуры и культурно-просветительной работы (фруктовые сады и т п.)

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **М. Голодед.**
Зам. Управляющего делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **Угаров.**

25 июня, 1928 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра рэгістрацыю скупшчыкаў сельскагаспадарчага сыру, прадуктаў і тавараў у райённых выканаўчых камітэтах

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Скупка прыватнымі асобамі сельскагаспадарчага сыру, прадуктаў і тавараў для перапродажу, а таксама на падставе даручэньня дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый дазваляецца толькі тады, калі скупшчыкі: 1) зарэгіструюцца ў раённых выканаўчых камітэтах, на тэрыторыі якіх будзе ці робіцца скупка, і атрымаюць ад раённых выканаўчых камітэтаў адпаведнае пасьведчаньне на права скупкі, 2) выконваюць правілы вядзеньня апэрацый скупкі, прадугледжаных пунктам 4 гэтай пастановы.

2. Раённыя выканаўчыя камітэты, сельскія і местачковыя саветы і міліцыя павінны наглядаць, каб скупка рабілася з захаваньнем умоў, паказаных у п. 1 гэтай пастановы.

3. На скупшчыкаў, што вядуць апэрацыі скупкі без захаваньня паказаных у п. 1 умоў, раённыя выканаўчыя камітэты накладаюць у адміністрацыйным парадку штрафы ў разьмеры да 50 рублёў.

4. Даручыць Народным Камісарыятам Гандлю і Фінансаў на працягу двух тыдняў выдаць правілы пра вядзеньне прыватнымі асобамі апэрацый скупкі.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**
Сакратар **В. Крывіцкі.**

г. Менск, 2 ліпеня, 1928 г.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

о регистрации скупщиков сельско-хозяйственного сыр'я, продуктов и товаров в районных исполнительных комитетах.

Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Скупка частными лицами сельско-хозяйственного сырья, продуктов и товаров с целью перепродажи, а также по поручению государственных и кооперативных организаций допускается при условии: 1) зарегистрирования скупщиков в районных исполнительных комитетах, на территории коих предполагается или производится скупка, и получения ими от райисполкомов соответствующего удостоверения на право скупки, 2) соблюдения правил производства скупочных операций, предусмотренных п. 4 настоящего постановления.

2. Районные исполнительные комитеты, сельские и местечковые советы и милиция обязаны наблюдать, чтобы скупка производилась с соблюдением условий, указанных в п. 1 настоящего постановления.

3. На скупщиков, производящих скупочные операции без соблюдения указанных в п. 1 условий, районные исполнительные комитеты налагают в административном порядке штрафы в размере до 50 рублей.

4. Поручить Народным Комиссариатам Торговли и Финансов в 2-х недельный срок издать правила о производстве частным лицам скупочных операций.

Председатель Экономичного Совещания при СНК БССР М. Карклин.
Секретарь В. Кривицкий.

2 июля, 1928 г.
г. Минск.

ЯК ПРАЙШЛА ВЯСЕНЬНЯЯ СЯЎБА.

Плян завозу насеньня амаль па ўсіх культурах выкананы з перавышэньнем: канюшыны—190,7 проц., ніпмафейкі—110 проц., вікі—234 пр., сэрадэлі—117 проц., лубіну—42,2 проц., лёну-даўгунцу—96 проц., лёну вывучайнага—375 проц., кораньплодаў—108 проц., аўсу—95,4 проц., ячменю—191,5 проц.

Недастача аўсу і лубіну была заменшана ячменем і вікай. Мінэральнага ўгнаеньня было завезена 8434 тоны. Па мінэральнаму ўгнаеньню, за выключэньнем тамасоўкі, плян выкананы поўнасьцю.

Што датычыцца забесьпячэньня с.-г. машынамі і прыладамі, то ў гэтай галіне ёсьць значныя дасягненьні; было завезена: 6357 плугоў, 8479 баронаў, 6558 асышнікаў, 619 селякаў, 4803 арфаў, 717 сартыровак, 119 ільтрашчотак, 231 трыер, 4646 малацарняў, 8592 сячкарні, 41 трактар і інш.

Аднак, трэба адзначыць слабы тэмп рэалізацыі плугоў вытворчасьці віцебскага заводу (33 проц.) з прычыны дарагоўлі іх, бо плугі саматужнай вытворчасьці каштуюць таньней. Таксама трэба адзначыць непрыстасаванасьць гэтых плугоў да ўмоў нашай вёскай гаспадаркі.

У мінулую вясну на абшарах БССР былі арганізаваны 388 с.-г. калектываў (98,7 проц. пляну) і 773 розных каапэрацыйных с.-г. аб'яднаньняў (59,4 проц.). Калгасы большай часткай дробныя, у якія ўвайшлі 1522 гаспадароў. З іх: беднякоў—59,9 пр., сераднякоў—31,1 проц., заможных—4,4 проц. Калгасы забясьпечаны крэдытам у 476,6 тысяч руб., для абслугоўваньня вызначаны асобныя працаўнікі. Да перашкод у арганізацыйнай працы калгасаў трэба аднесьці: адсутнасьць вопыту і патрэбнай літаратуры і цяжкасьці ў арганізацыі калгасаў па землях надзельных.

З каапэрацыйных аб'яднаньняў больш усяго арганізавана: масларобчых і сыраварных—141, машынных—197, мэліяцыйных—80, пасяковых — 68 і інш.

Вялікая праца выканана ў галіне кантрактацыі; закантрактавана: 17.849 гэкт. (89,2 проц.) лёну-валакна, 4976 гэкт. (46,8 проц.) лёну-насеньня, 1522 гэкт. (76,2 проц.) лёну пасляўнога, 1763 гэкт. (58,8 проц.) ячменю, 83,5 гэкт. (14 проц.) пiўнога ячменю, 6781 гэат. (82,5 проц.) бульбы, 1148 гэкт. (64 проц.) канюшыны і інш. Усяго было закантрактавана 36213,6 гэкт., што складае 75,8 пр. намечанага пляну.

Сёлета было пераведзена на шматпольле 152362 гэкт., што складае 121,8 проц. вызначанага пляну; увосені мяркуецца перавесьці на шматпольле яшчэ 250 тысяч гэкт. На шматпольле пераводзіліся галоўным чынам пасёлкі, калгасы і вёскі.

Ёсьць значныя дасягненьні ў галіне насеньняачышчэньня. Было вызначана ачысьціць 34.082 тоны, а ачысьцілі 37769 тон, што перавысіла заданьне на 110,8 проц. Арганізавана 4639 паказальных вучасткаў на 4639 гэкт. у 4796 гаспадарках. Таксама быў арганізаваны цэлы шэраг паказальных садоў і гародаў; праведзена 388 розных с.-г. курсаў.

Як характэрную рысу сёлетняй паляўной кампаніі трэба адзначыць значнае пашырэньне пляцу пасеваў бульбы, лёну і канюшыны.

Саматужнае ткацтва.

Беларуская сялянка ня толькі ўмее працаваць у хаце і на полі, што яна абшывае і абмывае сваю сям'ю, але вяўляецца яшчэ сапраўдным штукаром на ткацтву розных адмысловых абрусоў, ручнікоў, дываноў, пясоў і шмат інш. відаў ткацтва. Саматужныя сарвэты, анталяжы і вышываньне нашых сялянак носяць часта сапраўдны мастацкі характар, такія шэдэўры ткацтва могуць з гонарам аздабляць нават самыя вытрыманыя, стыльныя салёны.

Хто ня бачыў такія тканіны ў этнаграфічным аддзеле Беларускага Дзяржаўнага Музэю! І ўпэўнена можна сказаць, што каб такія тканіны дзе прадаваліся, то пакупцоў было-б больш, чым трэба. Адным словам, на нашым унутраным рынку можна было арганізаваць сыстэматычны збыт прадукцыі саматужнага ткацтва.

Аднак, ня гледзячы на гэта, у нетрах нашых шматтысячных беларускіх вёсак застаецца навыкарыстанай шмат рабочай сілы. Шмат жаночай рабочай сілы прападае, марна толькі таму, што мы ня ўмеем належна выкарыстаць гэту сілу.

Перад прамысловай каапэрацыяй і савецкімі арганізацыямі зараз стаіць ударная задача — выкарыстаць гэту жывую сілу, даць ёй належны ход, арганізаваўшы яе ў шматлікія арцелі. Вясковая беднота, удава, батрачка—усе могуць тут знайсьці паўны кавалак хлеба, на месцы, у вёсцы можна было вырашыць часткова беспрацоўе. Гэта новая крыніца заробку ажывіла-б вёску, яна дапамагла-б больш хуткаму ходу пралетарызацыі яе і дыфэрэнцыяцыі.

Тыя мерапрыёмствы, якія зараз ужыве беларуская прамысловая каапэрацыя ў галіне арганізацыі арцеляў па саматужнаму ткацтву, па нашай думцы, ня зусім здавальняючыя.

Гэта галіна прамысловасьці абяцае багатую будучыну, тут патрэбен больш шырокі размах у асыгнаваньнях і апэрацыйных сродках, патрэбен належны кадр інструктароў па арганізацыі арцеляў і па мастацкаму кіраўніцтву.

Справа гэта ўжо насьпела, і больш нельга марудзіць. Ад нас саміх, ад нашай ініцыятывы залежыць арганізацыя на цьвёрдым грунце вельмі паважнай галіны народнай гаспадаркі.

К. І.

ХРОНІКА.

У Прэзыдыуме Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

На барацьбу з дзіцячай бясьпрытульнасьцю.

Менскае т-ва „Прыхільнік Дзяцей" для ўмацненьня сродкаў на барацьбу з дзіцячай бясьпрытульнасьцю адчыніе ў Менску два магазыны: бакалейна-гастранамічны і галантарэйны.

Дзейнасьць Бабруйскай Акруговай Дзіцячай Камісіі.

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі быў заслуханы даклад аб дзейнасьці бабруйскай акруговай Дзіцячай Камісіі. З дакладу вызвалася, што матар'яльнае становішча камісіі палепшылася. Камісіяй арганізаваны пры дзіцячых дамох 9 майстэрань для навучаньня рамествам бясьпрытульных.

Асноўным недахопам прэзыдыум адзначыў слабае ўцягненьне грамадзкіх арганізацый у працу па барацьбе з дзіцячай бясьпрытульнасьцю.

Прэзыдыум запрапанаваў Дзіцячай Камісіі прадставіць дакладную запіску аб сродках, неабходных для аб'яднаньня майстэрняў у адну цэнтральную майстэрню.

Арганізацыя выставак дзіцячых устаноў.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі прызнаў неабходным арганізаваць увосьлед усіх округах выстаўкі дзіцячых устаноў і вытворчых майстэрняў.

Гэтыя выстаўкі будуць адчынены ў часе правядзеньня на БССР месячніку барацьбы з дзіцячай бясьпрытульнасьцю.

Налічэньні на білеты ў кіно і тэатры ў часе месячніка барацьбы з дзіцячай бясьпрытульнасьцю.

Нар. Ком. Фін. БССР даў згоду аб правядзеньні ў часе месячніка барацьбы з дзіцячай бясьпрытульнасьцю налічэньні на білеты ў тэатры і кіно. Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пастанавіў прасіць ЦСПСБ аб правядзеньні налічэньня на білеты, якія прадаюцца і праз рабочую касу.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

Сьвяткаваньне 100 гадовага юбілею са дню нараджэньня Н. Г. Чарнышэўскага.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў юбілей 100-годзьдзя са дню нараджэньня Н. Г. Чарнышэўскага адзначыць ва ўсіх прафарганізацыях у парадку клюбнай працы. Сьвяткаваньне юбілею будзе праведзена ў першай палове кастрычніка.

У час сьвяткаваньня юбілею ў клюбах, чырвоных куткох будуць праводзіцца гутаркі і даклады на тэму аб жыцьці і дзейнасьці Чарнышэўскага. У чытальнях пры клюбах і чырвоных куткох будуць наладжаваць галосныя чыткі твораў Чарнышэўскага.

Прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў усім прафарганізацыям свечасова набыць для бібліятэк адпаведную літаратуру аб дзейнасьці Чарнышэўскага, а таксама і яго творы, якія будуць выдадзены да дню юбілею Белдзяржвыдавецтвам.

Разьмеркаваньне месц у вячэрнім рабочым Унівэрсытэце.

Прэзыдыум ЦСПСБ на апошнім пасяджэньні зацьвердзіў разьмеркаваньне месц у менскі вячэрні рабочы унівэрсытэт. Усяго сёлета ў унівэрсытэт будзе прынята 103 чалавек. Гэтыя месцы разьмяркованы непасрэдна па саюзах, якія і будуць выдаваць камандыроўкі вызначаным ім таварышам для паступленьня ў унівэрсытэт. Месцы будуць прадастаўлены выключна членам саюзу гор. Менску пераважна рабочым ад варштату.

Прыём заяў будзе праводзіцца з 1 да 20 жніўня; прыёмныя іспыты ў унівэрсытэт адбудуцца з 25 жніўня да 1 верасьня.

Арганізацыя сэкцыі шклянь-нікаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ лічыць неабходным і мэтазгодным пры саюзе хэмікаў арганізаваць сэкцыю шклянь-нікаў. Арганізацыйная работа ў сэкцыі распачнецца з восені бягучага году.

Вызначэньне прадстаўнікоў у прыймовыя камісіі.

Прэзыдыум ЦСПСБ вызначыў сваіх прадстаўнікоў ва ўсе прыймовыя камісіі навучальных устаноў Менску (унівэрсытэт, рабфакі і тэхнікумы). Гэтыя прадстаўнікі ў камісіях будуць карыстацца рашаючым голасам.

6-ы тыраж 10 проц. выйгрышнай пазыкі 1927 г.

Чарговы тыраж 10 проц. дзяржаўнай выйгрышнай пазыкі выпуску 1927 году адбудзецца 20—22 ліпеня ў г. Ніжнім-Тагіле (Уральская вобласьць).

У гэтым тыражы будзе разыграна 4001 выйгрыш на агульную суму ў 700.000 руб. Сярод выйгрышаў 1 у 50.000 руб., 2—па 25.000 р., 5—па 10.000 р., 10—па 5.000 р., 71—па 1000 р., а рэшта па 250 і 100 р.

Арганізацыя антырэлігійных дыспутаў у Менску.

У сувязі з вялікай зацікаўленасьцю які выклікаў у Менску першы публічны дыспут на тэму: „Ці існуе Хрыстос", у цыпідэлак, 16 ліпеня ў летнім тэатру „Прафінтэрн" наладжваецца другі публічны дыспут на тэму «Ці існуе бог", дзе з дакладам выступіць маскоўскі праф. Пакроўскі.

Афіцыйным апанэнтам выступіць архіепіскап Віцебскі Александр.

Апроч гэтых дыспутаў у Менску будзе наладжан на рабочых клюбах яшчэ цэлы шэраг дыспутаў на тэму аб рэлігіі.

Імкненьне да вучобы.

У сучасны момант культаддзел ЦСПСБ праводзіць працу па разгляду заяў сяброў саюзаў для накіраваньня ў рабфакі БССР і РСФСР. Культаддзел будзе камандыраваць толькі сяброў саюзу Менску і округі. Наладжана дагаворы звыш 350 заяў, а Менскай акрузе вызначана толькі 40 месц. Апошняе сьведчыць аб надзвычайным імкненьні моладзі да вучобы.

Экскурсія турыстаў БДУ на Каўказ.

Учора, 14 ліпеня, з Менску выехала на Каўказ група турыстаў БДУ.

Мэта турыстаў—вывучыць Сухумскую дарогу і завітаць не прыгажэйшыя віды.

Экскурсія працягнецца паўтара месяца.

Лекцыі на тэму: „Кітай як ён ёсьць".

У бліжэйшыя дні культаддзел ЦСПСБ наладжвае шэраг лекцый у салсе „Прафінтэрн", а таксама на іншых саюзных садох і клюбах. Лекцыі будуць чытацца на тэму: „Кітай як ён ёсьць" т. Муроўцкам, які пражыў у Кітаі 2 гады. Лекцыі будуць суправаджацца дэманстрацыяй на экране 120 навейшымі зазьнятымі ў Кітаі карцінамі.

Экспэдыцыя ў Аршаншчыну.

У пачатку жніўня месяца Цэнтральнае Бюро краязнаўства накіроўвае у Аршанскую округу экспэдыцыю для вывучэньня Расьвенскага і Дуброзенскага райёнаў. Экспэдыцыя таксама пабудзе на Асінстроі.

Арганізацыя Плянава-Эканамічнага Бюро пры Белкаапсаюзе.

Пры Белкаапсаюзе арганізавана Плянава-Эканамічнае Бюро.

Мэта бюро—плянаваньне працы сыстэмы спажывецкай каапэрацыі БССР.

Апроч таго, бюро будзе займацца праверкай і аналізам плянаў, якія распрацоўваюцца аддзяленьнямі Белкаапсаюзу.

Пашырэньне экспарту.

Пар. Кам. Асьветы і Пар. Кам. Гандлю БССР разаслалі ўказаньне ўсім інспэктарам нарасьветы і гандлю аб неабходнасьці правядзеньня працы па выяўленьні і адбору прадметаў (карціны, гравюра, бронза, фарфар, скульптура) для экспарту па ўсіх музэях як дзяржаўных, гэтак і мясцовых краязнаўчых устаноў, саўгасаў і вучобных устаноў.

Для выяўленьня і адбору прадметаў запрапанавана стварыць камісіі з прадстаўнікоў акруговых аддзелаў нарасьветы і акруговых краязнаўчых т-ваў.

Асноўныя музэйныя калекцыі і прадметы, маючыя значэньне для БССР, адбору не падлягаюць.

Паляўнічыя справы.

27 тысяч членаў саюзу паляўнічых.

У склад беларускага саюзу паляўнічых уваходзіць 27 тысяч членаў. Саюз праводзіць арганізацыйную і культурную работу сярод сваіх членаў, хоць пакуль што яшчэ слаба.

Гадавальнік гончых сабак.

У Менску ўжо існуе гадавальнік ангельска-расейскіх і расейскіх гончых сабак. Зараз у гадавальніку знаходзіцца 12 кроўных вытворцаў. Пакуль што з гадавальніку атрыманы 20 шчанюкоў, якія разьмеркаваны па акруговых саюзах.

Выстаўкі сабак.

Дзеля выяўленьня ўсіх кроўных паляўнічых сабак у Бабруйскай і Гомельскай округах былі арганізаваны выстаўкі сабак. Апроч гэтага, у Магілеве, Полацку, Воршы і Барысаве былі наладжаны 5 вывадак паляўнічых сабак.

Палявыя выпрабаваньні.

18 і 19 ліпеня каля Барысаву будуць праводзіцца ўсебеларускія выпрабаваньні пад стрэльбу выжлаў. У сёлетнюю восень мяркуецца арганізаваць палявыя выпрабаваньні гончых сабак як па округах, так і ва ўсебеларускім маштабе.

Перад усебеларускай выстаўкай сабак.

На ўсебеларускую выстаўку сабак, якая будзе адчынена 21-га ліпеня, мае прыбыць каля 200 штук розных сабак: паляўнічых, службовых і па вышуку. За лепшыя экспанаты будуць выдавацца залатыя і срэбраныя мэдалі, каштоўныя прызы, надасланыя ўсесаюзным і ўсеукраінскім саюзамі паляўнічых і інш паляўнічымі арганізацыямі.

Менскі дзень.

4 аўтамабілі закупіла праўленьне Аўтадору БССР у Смаленску для ячэек Аўтадору.

262.621 галоў буйвай і дробнай рагатай жывёлы і 36.126 свіней было забіта ў мінулым годзе на 14 бойнях БССР, усяго на суму 292.744 р.

Пэрсанальная пэнсія ў разьмеры 50 руб. у месяц вызначана інваліду бойні чыгуначніку тав. Бардовічу за грамадзка-рэвалюцыйную працу.

На 10.865 700 руб. прададзена прамысловых тавараў і хлебапрадуктаў Белкаапсаюзам у працягу 3-га кварталу гаспадарчага году. За гэты-жа час закуплена тавараў на суму 10.579.600 р.

29-га ліпеня ў Менск прыяжджае цырк Кіссо, які працаваў у Менску ў мінулым годзе.

У дзяржаўным вандроўным тэатры.

Пасьля доўгага падарожжа па Полаччыне зьвярнуўся ў Менск Беларускі Дзяржаўны вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам тав. Галубка.

Зараз тэатр будзе адпачываць, а затым паедзе зноў у падарожжа Чэрвень—Сьмілавічы.

Дзеля падняцьця мастацкага боку тэатру, у тэатр запрашаецца на пасаду рэжысэра вядомы артыст расейскай драмы тав. Громін.

Склад артыстаў трупы будзе перагледжан і папоўнен новымі сіламі.

У рэпэртуар тэатру на будучы сэзон уводзіцца апроч п'ес другіх аўтараў, новая драма ў 5-ці актах на тэму з сучаснага жыцьця «Рвачы»—Галубка.

За ўдзельнікамі спартакіяды будзе захован іх заробак.

Паводле пастановы НКП БССР, за рабочымі і служачымі—удзельнікамі ўсебеларускай спартакіяды—на час спартакіяды але ня больш 6 дзён захоўваецца іх сярэдні заробак па месцу работы.

Газэта для батракоў.

ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых прыступае да выданьня 2-хтыднёвай газэты «Беларускі Батрак».

Газэта будзе абслугоўваць сельска-гаспадарчых і лясных рабочых БССР. Кошт нумару газэты—3 кап.

Стварэецца рэзэрвны фонд масла.

Пар. Кам. Гандлю БССР запрапанаваў Белкаапсаюзу прыступіць да стварэньня рэзэрвнага фонду кароўяга масла, у колькасьці вызначаным Эканомнарадам БССР.

Крэдыт на стварэньне фонду адчынен па лініі Дзяржбанку.

Пабудова 40-кватэрнага каменнага будынку ідзе поўным тэмпам.

Пабудова 4-павярховага каменнага 40-кватэрнага будынку жыльлёва-будаўнічага каапэратыву «Чырвоны Будаўнік» ідзе поўным тэмпам.

Ужо закладзен фундамант, падвальны паверх (этаж). Зараз узводзіцца першы паверх.

На будаўнічых работах занята зараз да 70 рабочых. Матар'ялы работы забясьпечаны.

Зьмяншэньне кошту грузаў невялікіх адправак.

Цэнтральнае праўленьне чыгунак распрацавала новыя правілы, згодна якіх гарадзкім станцыям мірадсастаўленьня права фарміраваць з дробных адправак, якія адрасуюцца на адну станцыю, больш буйныя адпраўкі.

Гэта значна ўдзешавіць правоз грузаў невялікіх адправак.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА.

Завоз гатунковых жарабкоў.

Сёлета на лініі жывёлаводна-племянных і каняводных т-ваў былі запуплены за межамі БССР 30 жарабкоў арлоўскага гатунку. На набыцьцё жарабкоў дзяржава асигнавала поўныя сродкі.

Стан ураджаю.

Вохлуг вестак Цэнтральнай Статыстычнай Управы стан ураджаю па БССР на 1-га ліпеня мае такі выгляд: сярэдняе па азімых—2,6, авёс—2,4, кумпсь—2,2. Сярэдняе па ўсіх яравых—2,4. Найбольш слабы ўраджай у паўночных округах. Полацкай і Віцебскай.

Пашырэньне шкоднікаў.

Сёлета вельмі пашыраны на палявых расьлінах розныя шкоднікі. Як агульнае зьявішча амаль ва ўсіх округах, на калосох жыта пашыран шкоднік „трыпс", ад якога бялеюць і мярцьвеюць вучастві колосу.

У кветках канюшыны пашыран шкоднік «доўганосік», які зьнішчае завязь з насеньнем. І, урэшце, каля Смалявіч ёсьць выпадкі пашырэньня гэсенскай мухі, якая дашчэнту нішчыць жыта.

Апавяшчэньне.

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

У аўторак 17-7 г. г. а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б Працасьветы.

Зьезд калгасаў Бабруйшчыны.

(Ліст з Бабруйску).

Зьезд калгасаў, які толькі што скончыў сваю працу ў Бабруйску, падвёў практычныя вынікі працы па выпаўненьню пастаноў 15 партыйнага зьезду ў справе калектывізацыі вёскі. Зьезд, грунтуючыся на дасягненьнях калгасаў, прымаючы пад увагу арганізацыю 38 новых калектыўных гаспадарак, са здавальненьнем адзначыў, што дырэктывы 15 партыйнага зьезду на Бабруйшчыне знайшлі сваё практычнае ажыцьцяўленьне.

Зьезд канстатаваў вялікую цягу сялянства да арганізацыі калектыўных гаспадарак, заявіў аб узмацненьні ўнутранага становішча нашых калгасаў.

На зьезьдзе шырока разгарнулася самакрытыка зьнізу. Прысутныя дэлегаты гаварылі цьвёрда і сьмела аб тым, што перашкаджае нашаму калгаскаму будаўніцтву. А перашкод гэтых шмат.

Шмат ёсьць яшчэ хворых бакоў у нашых калгасах. Аб іх і казалі на зьезьдзе.

Першае пытаньне—жаночае пытаньне. Яшчэ не ва ўсіх калгасах наша жанчына мае роўнае права з мужчынаю. Гэтае права далі жанчыне некалькі калгасаў (Расьсьвет, Утро Коммуны), а ў астатніх Калгасах жанчына—ня поўнаправны-сябра: яна ня ўдзельнічае ў сходах калгасу, мала ўцягнута ў грамадзкую працу. Супроць такога становішча выступалі сябры калгасаўскага зьезду, яны трэбавалі для жанчыны роўных з мужчынаю правоў.

Другое балючае пытаньня жыцьця калгасаў—аградапамога. Яна пакуль што слаба наладжана ў калгасах. Праўда, у апошнія часы прыняты меры да прымацаваньня аграномаў да груп калгасаў, але пакуль што праца вядзецца слаба.

— Мы хочам весьці гаспадарку пакультурнаму, па агранамічнаму,—заяўлялі дэлегаты.

А потым з абурэньнем калгасаўцы гаварылі аб шкодніцкіх кулацкіх учынках з мэтай падрыву працы калгасаў. Кулак лезе ў калгас, каб разбурыць арганізацыю, нашэптвае з боку аб вайне і іншых страхоцьцях. Але бурны рост калгасаў сьведчыць аб тым, які посьпех маюць гутаркі кулака сярод сялянства.

Гаварылі на зьезьдзе і аб тым, што скарыстоўваюць калгасы часам крэдыты не па прызначэньню, што некаторыя калгасы ня маюць недзялімага капіталу і г. д.

Пытаньню аб уцягненьні ў калгасы бедноты зьезд аддаў багата ўвагі, вынесшы пастанову аб узмацненьні сваёй працы на гэтым вучастку.

Разглядзеў зьезд і плян будаўнічага развіцьця калгасаў. У пляне прадугледжана значная праца па наданьню калгасам прамысловага характару ў сэнсе пабудовы розных заводаў для апрацоўкі сваёй сыравіны і прадуктаў.

А. Д.

За падняцьце вытворчасьці прамысловасьці.

(Па матар'ялах ВСНГ БССР).

Пасьля красавіка, які даў заметнае скарачэньне вытворчасьці прамысловасьці ВСНГ, май месяц ужо паказвае рост валавай прадукцыі на 4,4 проц. Найбольш інтэнсіўны прырост валавой выработкі назіраўся на скурана-абутковай, запалкавай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці, што ў сэнсе падрыхтоўкі таварных запасаў і забясьпечаньня будаўніцтва лесаматар'ялами належыць разглядаць як станоўчае зьявішча.

Вытворчыя праграмы выкананы з правышэньнем на 7,6 проц., але разам з тым зварочвае на сабе ўвагу недастатковае разгортваньне супроць пляну вытворчасьці мэталёапрацоўчай, панчошна-трыкатажнай, харчавой і акулярнай прамысловасьці. Апрача цяжкасьцей з сыравінай недастатковае выкананьне праграмы належыць растлумачыць некаторымі рыначнымі цяжкасьцямі (у адносінах дражджэй і піва) і ня поўным разгортваньнем будаўніцтва.

Як і раней, мае месца далейшае павышэньне дзённай вы[illegible]кі аднаго рабочага ў цэлым па ўсей прамысловасьці. Зноў такі прыцягваюць да сабе увагу меншыя посьпехі ў галіне вытворчасьці працы ў маі месяцы па шкляной, мэталё-апрацоўваючай, льнопрадзільнай, часткова швэйнай, масла-бойнай і папяровай прамысловасьці.

Учытваючы неабходнасьць падрыхтоўкі таварных рэзэрваў да надыходзячай кампаніі па хлебазагатоўках, неадкладнай задачай бліжэйшых месяцаў павінна зьявіцца паскарэньне разгортваньня прамысловасьці і абавязковае выкананьне вытворчага пляну. Адначасова ўдарнай задачай павінна зьявіцца прыняцьце рашучых мер да зьнішчэньня ўсіх недахопаў, якія перашкаджаюць далейшаму росту вытворчасьці працы. Гэты рост павінен забясьпечыць выкананьне дырэктыў у галіне зьніжэньня сабекошту прадукцыі.

Гэтыя дзьве асноўныя задачы павінны стаць у цэнтры ўвагі ўсей прамысловай грамадзкасьці ў творы вытворчых камісій і нарад.

СУД.

НЯЎДАЧНАЕ ВАНДРАВАНЬНЕ ВЯСКОВАГА НАЧАЛЬСТВА.

Старшынёю Бараньскага с.с. Халопеніцкага раёну быў Уладзімер Чарнуха, а сакратаром—Пётра Вашкевіч.

— Шмат праны—часамі казаў Вашкевіч старшыні.

Нічога! справімся, а калі і ня справімся, дык напляваць—хто нам што зробіць, а перад выбаршчыкамі мы зможам адлічыцца і ўсё будзе добра.

Калі так начальства размаўляла, дык ня лепш яно і працавала—цачкі папер месяцамі ляжалі без выкананьня, а Чарнуха і Вашкевіч вельмі часта вандравалі па вёсках—бывалі на вясельлях і хрэсьбінах, выпівалі і бывалі выпадкі, калі на вачох насельніцтва распачынялі бузу.

1 студзеня 1928 г. у вёсцы Прудох мясцоком служачых Лесбелу зрабіў вечар самадзейнасьці, на якім была прапанова выпусьціць жывую газэту, але Чарнуха і Вашкевіч, будучы пад мухай і ведаючы, што ў газэце будуць працягнуты яны за кенскую працу, падняслі супроць выпуску газэты пратэст, з прычыны чаго служачыя Лесбелу прымушаны былі вывесьці Вашкевіча і Чарнуха з памяшканьня, у якім быў наладжан вечар.

14 студзеня Чарнуха і Вашкевіч, вандруючы, напалі ў вёску Бара, разьнюхалі, што ў селяніна Ярмаковіча крэсьбіны зьявіліся туды, як запрошаныя госьці, добра выпілі—прымушалі піць супольна з імі камсамольца Барыса Чарнуху, а калі апошні адмовіўся, вывелі яго за хлеў і адлупцавалі.

Камсамолец Чарнуха заявіў па належнасьці і начальства па зьяцьці з пасад апынулася на лаўцы падсудных.

Выязная Сесія Менскага Акруговага Суду прыгаварыла: Уладзіміра Чарнуху і Пётру Вашкевіча па адному году выяўленьня, але прымаючы пад увагу першую судзімасьць і адсутнасьць цяжкіх вынікаў ад злачынства, замяніла пакараньне ўмоўным у працягу трох год.

Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Рабунак і гвалт.

Грам. вёскі Заневеданка, Капыльскага раёну Пётра Міхайлоўскі адзін з тых, якіх называюць прагавітымі да чужой маёмасьці. Ледзь што Міхайлоўскі ў каго прыкмеціў, стараецца яго прыбраць, а то проста ўжыць фізычную сілу і абрабаваць.

9 студзеня г. г. грам. Паўліна Сукала езьдзіла ў горад Слуцак за сваімі рэчамі, аб гэтым ведаў Міхайлоўскі і вачу сачыць калі яна будзе зварачацца з Слуцку, з мэтай абрабаваць яе.

На ведалёкай адлегласьці ад вёскі Заневеданка, Сукала спаткала Міхайлоўскага і Ламейку, якія затрымалі Паўліну Сукала, адвялі ў лес, па чарзе згвалтілі, а рэчы абрабавалі і, адпусьціўшы Паўліну, загадалі маўчаць, калі яна хоча жыць на сьвеце. Аднак Паўліна Сукала не маўчала і заявіла сьледчай уладзе. Ламейка ад суда захаваўся, а Міхайлоўскага Пётру Менскі акругові суд прыгаварыў на 6 год зьняволеньня.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 16-VII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—59,5 куп. 4—57,5
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—15, куп. 5—12
Абл. 2 сял. паз.—прад. 5,15, куп. 5,12
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—0,5,5, куп. 5—03,5
Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,07, куп. 25—97.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121—50, куп. 119—50.
Абл. 12 проц. паз.—прад. 101—53, куп. 101—48.
Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 25—06, куп. 24—91.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71.	З аўторка 10 ліпеня **„ЗАКОН ГОР"** у 8 частках. У галоўнай ролі вядомы грузінскі артыст Бостаеў. УВАГА! У выпадку дрэннага надвор'я сэансы пераносяцца ў кіно „Культура" (Зімні будынак—Валадарскага 7).
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка 10 ліпеня **„ЦЁМНЫЯ СІЛЫ"** у 8 частках. Зьвыш праграмы: гастролі Л. З. Леанідава, Ніны Тумаковай і Зэмгана.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	З аўторка **„ЖЫЦЬЦЁ ЗА ЖЫЦЬЦЁ"** у 10 частках. Пачатак а 7 гадз. 45 хв.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Прыключэнскі баявік **„МІС-МЭНД"** у 3-х сэрыях. Дзьве сэрыі ў адзін сэанс.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА

**ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, каапэрацыі, у кіёсках „Кніга Вёсцы" і на чыгуначных станцыях БССР у кіёсках „Контрагэнцтва